Дзяржаўная ўстанова
«Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка»

сектар інфармацыйна-бібліяграфічнай работы

# «Ёсць на зямлі такі куток...»

*да 1020-годдзя г. Слуцка*

Слуцк
2025

ББК 84.4Беі
Е 87

***«Ёсць на зямлі такі куток...»:*** да 1020-годдзя г. Слуцка / Дзяржаўная ўстанова «Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка» ; сектар інфармацыйна-бібліяграфічнай работы ; складальнік Р. В. Уласава ; рэдактар Л. В. Гурыновіч. – Слуцк [б. в.], 2025. – 176 с.

Зборнік паэзіі прысвечаны 1020-годдзю горада Слуцка - яго гісторыі, культуры і людскім лёсам. У зборніку сабраны аўтарскія вершы, а таксама песні, якія адлюстроўваюць унікальную атмасферу горада, яго багатую спадчыну і сучаснасць. Выпушчаны да Дня горада, зборнік служыць яркім напамінам аб значнасці Слуцка для жыхароў горада, натхняе чытачоў на гонар за родны край і яго шматвяковую гісторыю.

Адрасуецца шырокаму колу чытачоў.

Зямля мая, пад небам сінявокім
Красуешся і вабіш чысцінёй.
Чаруюць лёгкакрылыя аблокі…
Маё натхненне ты і гонар мой.

Ганна Міклашэвіч

Выданне прысвечана 1020-годдзю горада Слуцка — месцу з багатай гісторыяй, яркай культурай і асаблівай атмасферай. У зборнік увайшлі вершы і песні, прысвечаныя гораду, яго гісторыі і сучаснасці. У сваіх творах аўтары паказваюць яго чароўную прывабнасць, здзіўляючую адметнасць, шматграннасць і каларыт, а таксама яго адвечны духоўны пошук.

Зборнік уключае вершы і песні, прсвечаныя Слуцку і людзям, якія праславілі наш горад, напісаныя як вядомымі паэтамі Беларусі, так і мясцовымі аўтарамі. Уключаны таксама вершы жыхароў Слуцка, якіх родны горад натхніў на творчасць. Сабраныя творы напоўнены любоўю да роднага краю, павагай да яго традыцый і верай у светлую будучыню.

У зборніку прадстаўлена 8 тэматычных раздзелаў. Вершы ўнутры раздзелаў размешчаны ў алфавіце аўтараў.

Спадзяемся, што гэты зборнік знойдзе водгук у сэрцах чытачоў, натхне на новыя здзяйсненні і ўмацуе пачуццё гонару за наш горад. Няхай кожны радок стане напамінам аб тым, што Слуцк — гэта не проста месца на карце, а жывое сэрца нашай зямлі.

# СЛУЦК –
# МАЙГО ЖЫЦЦЯ
# СТАРОНКА

## МОВА
**Валянціна Аколава**

І вясну сустракаць, як здзіўленне,
Будзе кожненькі зелень-лісток.
Мова, колькі ў цябе пакаленняў,
Дзе бруіцца твой славы выток,
Дзе заўчора-звячора гавораць,
Дзе агонь пагарае-гарыць,
Дзе дзяўчаты вячоркі сну дораць,
Дзе ў зязюленькі крылца баліць?!
Край Случанскі — праменьчык Радзімы,
Ты былінны, таемны і дзіўны!
Пакуль мамы пяюць калыханку
І вітаюць буслы новы дзень,
Мая Мова, ідзі да людзей:
Ад святла да начы і да ранку!

## СЛУЦКУ
**Галіна Андрэйчанка-Мілянцей**

Я ў горад свой закаханая,
Тут усё так знаёма, жаданае.
Горад шчасця і добрых надзей,
Працавітых прыгожых людзей.
Прыязджайце ўлетку –
Колькі сонечных кветак.
Прыязджайце ўвосень –
За стол багаты запросім.
Горад-сад і легенда
Сівой даўніны.
Па-над Случчу-ракою

Задуменныя сны.
А вясною співаюць
Слуцку гімн салаўі.
Лепей краю не знаю
Беларускай зямлі.
Мая Случчына-маці,
Радзіма мая!
Мушу шчыра прызнацца
У сваёй вернасці я.

## ДЗЕНЬ ДОБРЫ!

**Анатоль Астрэйка**

Дзень добры Случчыне маёй,
Здаўна багатай старане,
Кужэльнай, рыбнай і грыбной,
З тарпамі хлеба на гумне,

З хацінамі, як ясны дзень,
З гасцінцамі паміж прысад,
Са шчырым сэрцам у людзей,
Калі ты па душы ім брат.

З адменным звонам добрых кос,
З гарачай песняй на жніве.
Дзень добры ззянню чыстых рос
У непакошанай траве!

Твае паляны і лясы
Далі прытул мне і пасцель,
Пярынай сталі верасы,
І маткай роднаю – шынель.

І славу продкаў і бацькоў
Памножым мы у сотні крат.
Ты будзеш, Случчына, ізноў
І жыць і красаваць, як сад.

## ДА СЛУЦКА

**Аляксандр Бянецкі**

Родны мой горад, ты слаўны са слаўных
У небе паўночным.
Ты Радзівілаў князёў дыядэма.
Ты гонар і іх прыгажосць.
Слуцк, ты багаты на золата і ураджаі,
Для гарадоў жа суседніх –
Сапернік адзіны ты ёсць.
Сад ураджайны, карміцель
багоў дабрачынны,
Правадыроў пералічым тваіх.
Святы абавязак кіруе тваімі сценамі!...
Слуцк, пераўзыдзеш сябе прыгажосцю
Сваіх перамог.

*(з лацінскай), 1625г.*

## МОЙ ГОРОД

**Артур Василенко**

Где бы мы на земле ни бывали:
В Нидерландах катались зимой,
Иль в Италии жаркой шагали –
Всюду помним наш город родной

Вспомним летнего утра молчанье,
В цвету белом весною сады.
Случи ласковой вспомним журчанье,
Плеск прозрачной и быстрой воды.

Вспомним улицы, скверы твои мы,
Вспомним неба простор голубой,
Где бы ни были, город любимый,
Сердцем нашим всегда мы с тобой.

## НАШ КРАЙ

**Людмила Вечер**

Хлебный край, замечательный край
Зовется в народе Слутчиной.
Похожа на маленький рай,
А может еще и лучше.

Земля, где рельеф, как ладошка, равнинный.
Где сытый, богатый народ живет.
Про слуцкий кирмаш и говорку слуцкую
Слава давно идет.

Скорняки удивляли мехами.
Сало, мясо и море меду.
Верещаки отведать с грибами
На хорошей беседе в субботу.

А налистники на удивленье
Со сметаной за милую душу идут.
И блины, и оладьи с вареньем
По-особому в Слуцке пекут.

В городе на улице одной
Уживаются разных конфессий люди.
Толерантной, веротерпимой землей
Называют наш Слуцк в Беларуси.

Центр православия здесь,
Намоленное место Софией.
Анастасии Слуцкой, защитницы, свет
Придает столько мужества, силы.

Поднебесная наша земля
Покорителей дала Вселенной.
Жуков, Герчик и Косберг трудились не зря,
Вклад в науку внесли несомненный.

Василь Витка отсюда родом,
Здесь он черпал свое вдохновенье.
Собирается много народа
На Витковские чтения.

Мастерской белорусской куклы
Еще город наш называется.
Слышим сказок знакомых звуки,
Праздник кукол у нас открывается.

Один из первых театров Беларуси
С акапельным пением,
И аптека, балетная студия,
Пояса с золотым плетеньем.

Родилась здесь царица садов,
Бэра слуцкая – чудо-груша.
Наша Слутчина – земля соловьев,
Музыкальная и певучая.

А талантов, хоть отбавляй,
В каждом доме поют и пляшут.
Здесь здорового юмора край,
Так приезжие люди скажут.

Сочинить можно целый рассказ
Нам о слуцкой родной стороне.
Чтобы встретиться еще много раз
На любимой и милой земле.

**ПАДАРОЖЖА ПА РОДНАМУ ГОРАДУ**

**Людміла Вечар**

На карце нашай краіны
У 103-х кіламетрах ад Мінска
895-гадовы горад старынны,
Што Слуцкам прыгожа завецца.

Вакол Слуцка лугі і палі,
Бульбу садзяць і сеюць збожжа
Мы з любоўю да роднай зямлі
Адпраўляемся ў падарожжа.

Наша Случчына – нібы казка,
Дзе рака так мілуе зрок.
І заўседы, як матчына ласка,
Нас да дому чакае здалек.

І спраў няма нам да холаду,
Адправіцца зараз у паход
Мы запрашаем па нашаму гораду
Вас, турысты, цікаўны народ.

Галоўная самая ў горадзе
Вуліца Леніна ў нас.
Яна мела назву ў народзе
Варшаўская колісь у свой час.

Да сумнай падыдзем сведкі.
Пастаім, памаўчым у цішыні.
На снезе чырвоныя кветкі –
Гэта помнік Афганскай вайны.

Далей, цераз мосцік касы
Падыдзем да Горкі Вялікай.
Дом культуры цудоўнай красы
Дзе граюць прыгожа музыкі.

А вось і цэнтральная плошча.
Выглядае яна дастойна.
Вецер чырвоныя сцягі палошча
Над помнікам вызваліцеля-воіна.

А за плошчаю крыху далей
Ведайце гэта месца
Дзе ўлетку пяе салавей,
А было тут страшнае гета.

У мінулае позірк направім,
У тыя часіны былыя.
Цябе мы ў вершах славім,
О, святая княгіня Сафія.

Побач з ею каплічка Варвары
Прытулілася каля Случы,
А рака ей так песні спявае,
Уранку, увечары, удзень і ўначы.

Паглядзіце, будынак старынны,
Хто ні йшоў, той заўседы дзівіўся.
Тут старэйшая школа краіны,
Тут Цэраскі калісьці вучыўся.

Маршал Жукаў у Слуцку служыў
У даваенны даўнішні час,
А вось дом, дзе з сям'ею ён жыў,
І сардэчная памяць ад нас.

Такія цудоўныя гукі,
Адкуль гэта музыка льецца!
Ты пастой, памаўчы і паслухай,
Гэты казачны замак музычнаю школай завецца.

Мы да парку так хутка дайшлі,
Ён і ўзімку прыгожа стаіць.
Тут гуляюць з снягамі вятры,
Лісце дзе-нідзе шамаціць.

Як прыгожа ў слуцкім парку!
Для сябе мы паспелі адзначыць,
Але рухацца трэба шпарка,
Каб цікавага шмат пабачыць.

Мы ўпэўнены, спадабалася
Падарожжа ў зімовы час.
Спадзяемся, прыгожа склалася
Замалёўка пра горад, пра нас.

Хай бягуць, хай ляцяць імгненні
Час не можа ніхто спыніць.
Старажытнага Слуцка праменні
Будуць у казках чароўных жыць.

## СЛУЧЧЫНА

**Васіль Вітка**

Ёсць на зямлі такі куток,
З якім навек я злучаны,
Адкуль ступіў свой першы крок –
Мая радзіма – Случчына.
Не зводзіліся ўсе вякі
На Случчыне паэты.
Вянкі іх песень – рушнікі,
Сурвэты – іх санеты.
Увекавечыў Слуцак нас
Сваімі паясамі.
А пра цяперашні наш час
Вы ведаеце самі.
Пачуўшы ад старых людзей,
На ўласны смак праверыў –

Няма нічога саладзей
Славутай слуцкай бэры.
А тыя, хто памаладзей,
Перадаюць унукам –
Няма нічога саладзей,
Чым слаўны слуцкі цукар.
Сябры, паверце земляку:
За век свой некароткі
Я ўпэўніўся, што случаку
Увесь наш край салодкі.

## ГОРКІ ВЫРАЙ

**Васіль Вітка**

Будзеш ты усюды неразлучаны
З першымі ўспамінамі жыцця,
З ціхаю тугой па роднай Случчыне,
З шолахам альховага лісця,

З тою прыдарожнаю алешынай,
Што ў зацішшы пры шашы шуміць.
Хіба ж есць у свеце шчасце лепшае,
Як пад небам бацькаўшчыны жыць?

Дужым і разгалістым карэннем
Разраслося дрэва з той пары,
Як узяў на ростані ў кішэню
Ты кавалак цёплае кары.

Невядома, колькі давядзецца
Даўкую тугу ў душы нясці,
Толькі вечна маладому дрэўцу
Случчынай у памяці цвісці.

Прыйдзе час – алешына сустрэне,
Пры шашы ў зацішшы зашуміць.
Не сустрэне – адшукай карэнні,
Ласкай успаі – і дрэва будзе жыць.

## САКУНЫ

**Васіль Вітка**

Мы на Случы ўсе – сакуны,
Завомса сакунамі.
Спрадвеку хлеб наш сакаўны
І мова сакаўная.

Звязала рушнікам рака,
Тугім вузлом злучыла
З лесавіком палевіка
І дружбе навучыла.

Здавён адзін на аднаго
Мы не глядзелі скосо,
І хоць пабачылі ўсяго –
Усё перажылосо.

Наб’е гузак, хто вытнецца,
Пацэліць той, хто меціцца.
Бо як яно рабіцьмецца,
Дык так яно і мецьмецца.

І нечага аюцкаць,
Калі пастух някемны,
У слуцку ўсё па-людску –
І случакам прыемна.

Яшчэ ў калысцы спіць сысун,
А толькі абазваўся,
І ўжо ён – выліты сакун,
Увесь у бацьку ўдаўся.

Глядзіш, мацнейшыя харчы
У місе падварушвае.
Не трэба нават і вучыць –
Так лыжкай апічушвае.

Расце сабе, у вус не дзьме,
Наказ шануе дзеда:
На Случчыне Андрэй Кузьме –
Заўсёды родны Хведар.

І сам удаўся я такі,
Шчаслівы вам прызнацца:
З адной рукі, з другой рукі –
Скрозь слуцкае сваяцтва.

Дадому еду – і здалёк,
Нібы палотны белячы,
Бяжыць бярозавы гаёк,
Дарогу сцелюць Еўлічы.

Пра іх ніколі на вяку
Нідзе не мог забыцца.
У весніцах стары цвыркун
Пілуе марш на скрыпцы.

Чмель трубіць у гарбузны цвет
На ўсё сяло святочнае.
Не блізкі абышоўшы свет,
Канцы з канцамі сточваю.

Тут між балотнага куп’я
Ўзлятала песня кнігаўкай.
Зрасталася душа мая
З маёю лепшай кнігаю.

У ёй – імёны, адрасы,
У ёй – мае случане,
Жывых – жывыя галасы
І тых, што замаўчалі.

Падчас і я ў трубу трублю,
На скрыпачцы пілую,
Што, мілую, цябе люблю,
Зямлю сваю – малую.

А ты жыццё прайшла са мной,
У свет вяла і клікала.
Ніколі без цябе, малой,
Не знаў бы я вялікае.

Яшчэ не сплочаны мой доўг.
Перад табою немы,
Я ўсё шукаю свой радок
Дзеля тваёй паэмы.

## В ЭТОТ ГОРОД Я С ДЕТСТВА ВЛЮБЛЕН

**Василий Волчков**

Я по Слуцку опять заскучал,
По зеленому саду и небу.
Милый город –
Мой давний причал,
Скоро в гости
К тебе я приеду.
Утром рано,
Чуть явится свет,
Я пешком обойду
Древний город.
И, не чувствуя
Тяжести лет,
Снова стану я
Весел и молод.
Тут, как прежде,
С утра на рассвете
Комары неустанно гудят.
Улыбаются искренне дети,
Звезды падают,
Сосны звенят.
Посмотрю на поля
Золотистые,
На росистые травы хмельные,
На ржаные хлеба
Колосистые,
На цветы васильки
Голубые.
И упьюсь я
Речами веселыми
С дорогими людьми,

Буду счастлив
От встречи с просторами
Нашей слуцкой
Прекрасной земли.
Ничего, что я
В Курске родился,
А на Случчине
Годы прожил.
В этот город
Я с детства влюбился.
В час разлуки
Смертельно грустил.

## ГОРАД ДЗЯЦІНСТВА

**Н. Дваранчук**

Мой горад дзяцінства далёка,
У думках маіх ён жыве.
І толькі закрыць маю вочы,
Як ён прада мною ўстае.

Гадоў яму, кажуць, нямала,
Буйное пражыў ён жыццё.
Не раз яго лікі мяняля
Варожых набегаў кап'ё.

Ды зноў узнімаўся ён з пеплу,
Асілкам стаяў на зямлі.
Карагоды дубоў векавечных
Яму прыгажоць надалі.

Будуецца горад, красуе,
І столькі прыемных хвілін
Мой горад заўжды мне даруе,
Такі на зямлі ён адзін.

І зноў я чакаю спаткання,
Прыгожы мой Слуцк, дарагі.
Каб бачыць увечар, уранні,
Прасторы, Случы берагі.

Табе пажадаць хачу долі,
Пяшчоты і моцы навек,
Каб сумным не быў ты ніколі,
І радасна жыў чалавек!

## ДНЮ ГОРОДА

**Петр Девятериков**

С седой старины на Случи стоит
Город-солдат сотни лет.
Слава его сквозь годы стучит
В стихах он и в песнях воспет.

Князь-воевода его укрепил,
Стены воздвигнул и рвы.
Дружину свою в него поместил,
Отважных стрельцов боевых.

Не раз подступали татары к нему,
Но захватить не смогли,
Побиты на стенах, тонули во рву,
Но многое все же пожгли.

Однако, как феникс, из пепла восстал,
Построил дома и мосты.
Молились христиане иконе Христа,
На храмах блестели кресты.

Война громыхнула – не ждали,
В город фашисты пришли,
Невинных людей убивали,
Вешали, резали, жгли.

Но город с врагами боролся,
Созвал патриотов-бойцов.
Враг на отпор напоролся,
Изведал удар храбрецов.

Сейчас у нас тихо, спокойно,
И жизнь трудовая кипит.
Город поднялся достойно,
Народ его любит и чтит!

## СЛУЦК – МОЙ ГОРОД

**А. Дубовик**

Мало сказать, что тебя я люблю.
Росы твои, твои ночи, зарю,
Мало сказать, что дышу я тобой,
Просто – сказать, что моею судьбой,
Стал ты, мой город, старый и мудрый,
Ночью притихший и дремлющий утром,
И принимающий юный рассвет…
Только скажу, что милей тебя нет!

Нет и роднее кусочка земли –
Здесь мое детство и юность прошли,
Узкой тропой для меня незаметно,
Кончилось, кончилось доброе лето
Дней моих жизненных, славных и строгих –
Осень меня сторожит у дороги,
Но и она, моя осень, прекрасна,
Город мой милый, к тебе не напрасно,
В сердце своем постоянно ношу,
Преданность, верность, и строки пишу
Пусть неумелые и очень скромные,
Но надо мной твое небо огромное,
Где-то в ветвях слуцких бэр заплуталось,
В сердце вошло мое, там и осталось
Песней названье такое неброское,
Слуцк. Тебя узкой полоскою,
Случь огибает, неся свои воды,
Я забываю с тобою невзгоды,
После разлуки, даже недолгой,
Но мне не кажется трудной дорога,
К дому родному, к садам твоим пышным,
Где, как невесты, волнуются вишни.
Мало сказать, что тебя я люблю...

## СЛУЦКУ

**Іван Жогла**

Па-над рэчкаю Случ ты стаіш велічава
Старажытны наш Слуцак амаль дзевяць вякоў.
Многа бачыў няўзгод, калі наша дзяржава
Запрашала на войны тваіх землякоў.

Многа ворагаў бачыў у ліхія гадзіны,
І заўсёды змагаўся, да апошняе кроплі крыві.
Толькі помнікі сведчаць пра тыя часіны
І лампадаў гараць пастаянна агні.

Пасля войнаў з руінаў цябе падымалі
І заўсёды наш Слуцак яшчэ прыгажэў.
Толькі б дзеці і ўнукі больш гора не зналі
І каб ты, мілы горад, у жыцці не старэў.

Дык жыві ты ў міры і згодзе вякамі
Яшчэ многа вякоў тчы свае паясы.
Няхай родзіць зямля збажыну каласамі
На карысць усім людзям у любыя часы.

## З МІНУЛАГА

**А. Жук**

Там, дзе плешчуцца воды ласкавай Случы –
Уцякачкі з палону балот і лясоў,
На радзімай зямлі ўзвялі дрыгвічы
Горад Случаск, вядомы з даўнейшых часоў.

Працавітыя людзі былі случакі:
Хто – умелы кушнер, хто – рыбак ці кравец,
Хто з рання на балоце цягаў карчакі,
А каторы быў рымар ці майстар-шавец.

Калі ж ворагі-злыдні ўчынялі разбой,
Неслі гора, няволю і смерць-небыццё,
Случакі, як адзін, уставалі на бой:
Ім свабода была даражэй за жыццё.

У той час, пра які я гаворку вяду,
Неспакойна было на дрыгвіцкай зямлі:
Кожна лета прыносілі гора-бяду
Крымчакі, што ў стэпах далёка жылі.

Вось і зараз шалёнаю зграяй татары
Па-над Случчу стаяць. Таму сведка рака,
Як Трайчаны і Востраў знішчаюць пажары,
Шле смяротныя стрэлы варожа рука,

І над горадам копаць і дым сталі хмарай,
Вось упаў акрываўлены вой малады:
Няма сіл біцца з моцнай татарскай навалай.
І радзеюць случанскай дружыны рады.

А чужынец, здаецца, адчуў перамогу.
Па горадзе скача ганец на кані:
–Усе на падмогу! Усе на падмогу!
Інакш у пякельным загінем агні.

Пачуўшы адчайны той заклік, случанкі
Сваіх дзетак пабралі, бягом – да сцяны
Гарадской. Там, дзе лётаюць стрэлы-каванкі
У адважнай рашучасці сталі яны.

І выйшла наперад Настасся Мякота,
Прыціскае сыночка свайго да грудзей.
Хоць вусны дрыжаць, з вачэй знікла маркота.
Яе словы бы з неба ляцяць да людзей:

–Воіны слуцкія, стойце нярушна!
Біцеся смела, мужы і браты!
А вы, мае сёстры, сяброўкі, скажыце:
Як нам, нашым дзеткам пад ворагам жыць?
Да зброі ўсе! Хто што можа бярыце,
Лепш загінем, а здзеку, няволі – не быць!

Гэтым часам татарскі султан Буранаш
На штурм града апошні загад аддае:
–Упярод, мае нукеры! Случаска – ваш,
Кожны можа папоўніць багацці свае.

Задрыжэла зямля ад варожай напасці.
Робяць справу сваю самастрэлы, мячы:
А над смертным гармідарам – вокліч Настассі:
Бі паганцаў праклятых, калі іх! Сячы!..

І адкуль толькі моц абаронцы ўзялі:
Адагналі татараў ад нашай зямлі.
Помняць, напэўна, кляпчанскія гоні,
Як пахне крывёю, як дзіда звініць,
Як бязлітаснай слуцкай пагоні
Вораг не мог ні стрымаць, ні спыніць...

## СЛУЧЧЫНА

**Мікола Жук**

Зеленеюць кусты вербалозу, ракіт
Па-над водамі ціхае Случы.
Не адзеты яе берагі ў граніт,
Размываюцца хвалямі кручы.
На яе берагах не ўбачыш красы,
Каб адразу цябе пакарыла.
Заліўныя лугі тут сустрэнеш, лясы
І герояў-байцоў магілы.

Але я тут вучыўся Радзіму любіць,
Тут я першай прайшоў баразною,
Тут братоў чатырох не магу забыць,
Што адсюль пайшлі ў полымя бою.

Тут і сам я не раз на заданні ішоў,
Што даверылі мне партызаны,
Тут для гнеўнае песні шукаў я слоў
У памяць воінаў закатаваных.

З партызанамі тут я байцоў сустракаў,
Што Радзіму маю вызвалялі...
Не знайду я нідзе і не буду шукаць
Прыгажэйшых на свеце даляў.

## СЛУЧЧЫНА

**Мікола Жук**

Я помню яе такой:
Сонца ўзыходзіць над борам,
Туманы плывуць над ракой,
Мятаю пахне, чаборам.

Звон адкляпаных кос,
Рыканне кароў ля аселіц.
Галінкі плакучых бяроз
Пад сонцам гарачым самлелі.
Да небакраю лугі.
У кветках ружовых і сініх.
Буслы набіраюць кругі,
Знікаюць у небных вышынях.

На постацях спелых ніў
Першыя жнеі спяваюць.
Гарачыя летнія дні,
Чароўная свежасць начная.

Суніцы ў стазвонным бары,
Грыбы пад ігілцай і лістам...
З дзіцячае светлай пары
Я помню цябе прамяністай.

Я помню ў агні бліскавіц
Твае пасмутнеўшыя далі.
О, колькі было навальніц
У гуле пагібельнай сталі.

А выжыць усё-ткі змаглі
З дзяцьмі, назаўжды дарагімі...
Хачу, каб мы ў шчасці жылі
З табой, дарагая радзіма.

## Я ЛЮБЛЮ ЦЯБЕ, МОЙ ГОРАД

**Ніна Зяневіч**

Я люблю цябе, горад мой.
Твой узрост мяне сёння радуе,
Старажытны, прыгожы мой Слуцк.
Ці сцяжынка, ці дожджык падае,
Я люблю цябе, родны мой кут!
Я люблю твае вуліцы сціплыя
У чароўнай цішы начной
Ці ўдзень, ад машын асіплыя,
Я люблю цябе, горад мой!
Тваe святы і будні імклівыя,
Што складаюць жыцця карагод,
Няхай будуць заўжды шчаслівыя.
Дары радасць, наш Слуцк, з году ў год!
Мой горад – мая надзея,
Давайце зверым гады:
Слуцк налічыў іх замнога...
Мой горад – такі малады,
Хоць доўгай была дарога.
І трывожнай была, і хвалюючай,
Гісторыя памяць кране.
Гады ж бальзамам гаючым
Зацягвалі раны тваe.
І цешылі ранкі золкія,
І салаўіны спеў,

І спавівалі вясёлкамі –
Ад гэтага ты маладзеў.
Ад сінявы маладзееш,
Ад шэпту чароўных слоў.
Мой горад – мая надзея,
Я люблю цябе зноў і зноў!

## СЛУЦК, ТЫ ЛУЧШИЙ НА СВЕТЕ...

**Зеневич Нина**

Ни Париж, ни Чикаго-сити,
Так известные на планете,
Тихий город моих открытий,
Слуцк, ты лучший на свете.

И вобрав в себя земные тайны,
Не величие и простоту,
Ты меня посвятил случайно
В эту сказочную суету.

И с тех пор я не знаю покоя,
Не избавиться мне от проблем.
Слуцк, скажи мне, что это такое?
Какой тесный у нас тандем!

Принимаю все щедрости мира
Через призму твоей доброты.
Не творю я себе кумира,
Просто знаю: кумир - это ты.

Слуцк, ты молчание и стихия.
Водопад твоих мыслей ловлю
И пишу все свои стихи я,
Потому что тебя люблю!

## САКАННЕ

**Ніна Зяневіч**

Цябе здзіўляе наша саканне,
Наш Слуцкі моўны каларыт?
А хтосьці оканнем ці аканнем
Распавядае пра свой быт.
Хай разлятаюцца гаворкі,
Случчане сакаюць няхай.
Квітней, любімая старонка,
Моя мілы кут, мой родны край.

***

**Міхась Кавыль**

Случчына, мой сон ты светлакосы,
Казка на начлезе ў бары;
Матчыныя слёзы ў буйных росах,
Жаваранка песня на зары...

## РОДНОЙ ГОРОД

**Елена Картынник**

Быть может, есть красивей город,
Но город Слуцк – любимей всех.
Мне город этот очень дорог
И люди в нем, и их успех.
Люблю про город я свой слушать,
Чтоб больше тайн его узнать,
Увидеть памятники, скверы
И их историю понять.
Княгиня всем нам завещала
Беречь наш город дорогой,
Чтоб он, красивый и большой,
Стоял, на годы невзирая,
И радовал людей всегда
Неповторимой стариной
И современной красотой.
И пусть он – небольшой, мой город,
Но – лучший город на Земле,
И дорог он тебе и мне!

***

**Ізяслаў Катляроў**

Случаск, Слуцк - сугуччам рэха
тых, з «Аповесці», часоў, -
прачытаннем нават гэта
бачу там, дзе гук сышоў.
Дзесь з дванаццатага веку
распачацца сказ гатоў...
Як шкада, што памяць веху

не ўмясціла з тых асноў!
Слуцкім княжаства завецца,
бо з Евангеллем сваім.
Слуцкі летапіс вядзецца,
ў ім - нікога, ўсе - у ім.
На гербе ж - Пегас натхнёны
з радзівілаўскай каронай.

* * *

**Инна Козина**

Стоит моя старая школа
На круче над Случью рекой.
Сюда я приехала снова
Потрогать те стены рукой.
Пред нею высокие клёны
Приветливо шепчут листвой
Так, словно далёкие звоны,
Ты нас посадила весной.
Весна моей юности тихо
Напомнила мне о былом,
Когда я девчонкою лихо
Бежала вот этим двором.
По узкой заросшей тропинке,
Откинув лет сорок долой,
Я с детством весёлым в обнимку
Шагаю, как прежде, домой.
Всё стало здесь вроде бы уже,
Изба как-то в землю вошла,
Но так же приветливы люди
На улице, где я росла.

Схожу на погост ненадолго
И предкам своим поклонюсь,
Не надо судить так уж строго:
Люблю я свою Беларусь.
И пусть говорливая речка
Построит из радуги мост,
Раскинет над каждым крылечком
Оберег из солнца и звёзд.

## УРЫВАК З ПАЭМЫ «НОВАЯ ЗЯМЛЯ»

**Якуб Колас**

Прад імі Случчына ляжала,
Старонка міла і багата.
Народ, відаць, жыў панавата,
Прынамсі, добра і заможна,
Па ўсім аб гэтым судзіць можна:
Па ветраках, такіх удумных,
І па абэржах гэтых, гумнах,
Па старасвецкіх азяродах,
Па гарбузах на агародах,
Па тытуню і па садочках,
Дзе хаты ніклі, бы ў вяночках.
А тыя ліпы ці таполі!
Такіх не бачылі ніколі:
Развіслы, тоўсты, сакавіты,
Гамоняць з небам – паглядзі ты!
За многа вёрст здалёк відаць.
– Ну, дрэвы! нечага сказаць;
Зямля, брат, сілы многа мае –
Такія вежы выганяе!
А роўнядзь, роўнядзь! як далоні! –

Міхал зазначыць ці Антоні:
– Эх, брат, зямля: ўмірацць не трэба,
Не пашкадуе табе хлеба.
Ўсё прыцягала іх увагу:
Ці ўстрэнуць родную сярмягу –
І людзі простыя так ветлы,
І погляд добры іх і светлы
Так да душы і пранікае
І сэрца цешыць і ласкае;
Ці хутарочак пападзецца,
Ну, як знаёмы, усміхнецца!
Ці гэта вёска з ветракамі
І з прыдарожнымі крыжамі, –
Ўсё так павабна, так адметна,
І ўсё вітала іх прыветна,
Бы тая блізкая радня.

## МАЛЕНЬКИЙ ГОРОД

**Елена Колодзинская**

Мой маленький город,
мой сказочный рай!
Я в странствии вечном
в далеких краях
В душе согревала
свет улиц твоих,
Красоты других
городов полюбив.
Красоты безмерны,
красоты безмежны,
Но самым любимым,
прекрасным и нежным
Живет в моем сердце

мой маленький город –
И тайная грусть,
и высокая гордость
За ветхие крыши
старинных кварталов,
За стены из камня
в небесные дали.
Мой маленький город,
я тихую песню
Пою для того,
чтобы стало известно,
Что даже туман
тебе серый к лицу,
Любимый мой город,
мой маленький СЛУЦК.

***

**Мікола Корань**

Живём мы у старажытным Слуцку.
Ты маладзееш з кожным годам, любы!
Жыццё цячэ у горадзе па-людску,
Галоўны гонар — гэта нашы людзі
Тут вуліцы заўжды ў чысціні,
З вясны і да зімы — увесь у кветках,
І заліваюцца у парку салаўі,
Тут шмат гуляе мам і дзетак.
Мы ганарымся спадчынай сваёй,
Тут паясы мы ткалі залатыя.
Прад ворагам галоў мы не схілілі,
Бо з намі ў душы заўжды была
заступніца Сафія!

Да вас зварот мой, дарагія землякі,
Любіце горад і родную зямельку,
І будзе шчасце з вамі на вякі,
Бо без любові, як без памяці, жыць нельга.

## СЛУЧЧЫНА МАЯ

**Антось Красавіцкі**

Дзе самыя блакітныя нябёсы
І рэчка з лесам песцяцца ў красе?
Дзе самыя духмяныя пракосы
Укладваюцца ранкам па расе?

Дзе краю той, што на майстроў багаты,
Куды спачыць ляціць душа мая?
Дзе самыя прыгожыя дзяўчыты
І самы звонкі пошчак салаўя?

Адказ на гэта просты і адзіны
Даю вам я, тутэйшы чалавек:
Той край – мая «маленькая Радзіма»,
Што Случчынай завецца з веку ў век.

## СЛУЦКІ КРАЙ

**Марына Курловіч**

Здаўна вядомы Слуцак-град,
Гасцям заўсёды быў ён рад.
Народ тут працавіты жыў,
Хоць ліха шмат ён перажыў.

Случчане вольнымі былі,
Сваю свободу берaглі.
Пад кіраўніцтвам княгіні одной
Войска адбілі Арды Золотой.

Яшчэ ў мінулыя часы
Славу мелі паясы,
Нават сам князь Радзівіл
Слуцкі пояс ацаніў.

Слуцк прайшоў нялёгкі шлях,
Стаў героем у баях.
Але сёння - паглядзі!
Куды толькі ні зайдзі,
Город чысты і прыгожы,
Каго хочаш заварожыць.

Дык давайце ж мы, сябры,
Будзем тут гаспадары.
Чысціню захоўваць будзем,
Свет і радасць дарыць людзям,
Каб яшчэ мільёны год
Слуцкі славіўся народ.

## Я ВІНШУЮ ЦЯБЕ, ВІНШУЮ!

**Алена Лабковіч**

Дзень нараджэння вялікага горада!
Сэрцам, душою хачу ўвайсці
Углыб тых часоў, што хаваюць ад погляду
Дзевяць вякоў таямніц, ціплыні...
Ніцыя вербы глядзяцца галінамі
У ціхаструменныя плыні Случы.
Дзевяцісоты гадочак сустрэнулі
Слуцкія воды... Давай памаўчым.
Дай, зямля, мне дазвол на хвіліну,
Адчуваючы веліч падзеі,
Зазірнуць у святыя даўніны –
Горад любы мой, чарадзейны.
Слуцк, зямелька мая, зямля-маці,
Раскажы пра сыноў і дачок:
Як любілі дзяўчаты спяваці,
Як у паніцы вораг уцёк.
Раскажы, як прыходзілі людзі,
Засялялі цябе, абжываліся.
Капаў пот на змарнелыя грудзі,
З немаўлятамі люлькі гойдаліся.
Бачыш, дні тушаць цёмныя ночкі
Год за годам і век за векам...
Усё на свеце пакіне слядочкі,
Памяць доўгая - след чалавека.
А ў Слуцку - легенды жывыя:
І сягоння ў гонар княгіняў
Найчасцей наракаюць дзяўчынак
Імем Соф’я і Анастасія.

Каб жыцця свайго сэнс пазналі мы,
Маладзенькі князь Юрый Юр’евіч
Ад рукі перапіша Евангелле,
Горад з небам навек заручыўшы.
Птушка белая - маці Сафія
Створыць горад наш духа аазісам.
У малітве яе невычэрпная сіла –
Праваслаўем горад уславіўся.
Тут, у Слуцку, людзі асветы
Завіхаліся, білі ў набат:
Нарадзілася школа - у Беларусі першая,
Потым школа балета, тэатр.
Зараз словы знайду жыватворныя,
Меданосныя - сэнсу абсяг,
Каб праславіць мне творчасць народную, -
Слуцкі пояс - наш Слуцкі сцяг!
І сягоння імкнуцца да зорак
Галубы нашай слуцкай зямлі.
Шлях праклалі Цэраскі і Косберг,
Следам іх пойдуць нашы сыны.
Горад мудры мой і гасцінны,
Бачу скроні твае сівыя,
Ранкам летнім хор салаўіны
У твой гонар складае гімны.

## МОЯ СЛУЧЧИНА

**Анастасия Лесун**

Страницы жизни – святая книга,
В её анналах – судьба Земли:
Созданье мира... Батыя иго...
И космос рвущие корабли...

Немало память сохранила
Преданий грозных седых веков,
Времен Олельки и Радзивилла.
И слуцких вытканных поясов...

И лихолетье чужих набегов,
И партизанских костров огни,
Чего наш край лишь не изведал,
Но в страхе голову не склонил.

Вот потому-то нам он дорог,
Что имя гордое свое сберег –
Строка истории – Случеск-город,
Как перекресток путей-дорог.

Век наступивший... Что изменилось?
Наш город сразу и не узнать,
Как будто все это мне приснилось –
Какой простор и какая стать!

Вдоль улиц чистых – дома-«картинки»,
И будет щедрым наш каравай.
Как праздник Хлеба, прошли «Дажынкі»,
Гостей приветствовал Слуцкий край!

Нам есть без выдумки чем гордиться,
И вот сказать мне хотелось что:
Пускай наш город – и не столица,
Но ее спутник он – на все сто!

И неразрывно мудрой силой
Слова поэта через года:
«Мой родны кут, як ты мне мілы!» –
Мой Слуцкий край, цвети всегда!

## НАШ КРАЙ СЛУЧЧАНСКІ

**Андрэй Лешчанка**

Палі, сады, прастор случчанскі,
Край беларускае зямлі,
Дзе сцежкі славы партызанскай
У кожным сэрцы праляглі.

Па-над прысадамі падняўся
Наш родны Слуцк, як чарадзей.
Тчэ паясы ў добрым часе,
Прымае ў радасці гасцей.

А ў палях шумяць маторы,
Там горы спелай збажыны.
Рука случчан багацце творыць,
Натхненне, праца тут відны.

Жыві, красуйся, край случчанскі,
Дарогу славы расшырай!
Ідзі, твары пад зоркай шчаснай,
Наш дарагі, багаты край!

***

**Андрэй Лешчанка**

Мой Слуцкі край, як ты мне дораг!
Я тут радзіўся і жыву.
Цябе не мог асіліць вораг,
Цябе ўсе Случчынай завуць.

Люблю я слуцкія прасторы:
На іх бацькоў маіх сляды,
Тут старажытны дзіўны горад
Вянчае сёння маладых.

Тут спеюць нівы залатыя,
Сады аж гнуцца ад пладоў,
Чубы дубоў і ліп густыя
І вабнасць новых пабудоў.

Па вечарах гарацъ, бы зоры,
Неону пышныя агні.
Случчанскі край, як ты мне дораг;
Паклон ад сэрца мой прымі!

***

**Андрэй Лешчанка**

Па-над прысадамі падняўся
Наш родны Слуцк, як чарадзей.
Тчэ паясы ў добрым часе,
Прымае ў радасці гасцей.

## СЛУЧЧЫНЕ

**Максім Лужанін**

Учора мы разам хадзілі ў анучынах,
Малолі на хлеб у старым ветраку.
Ды гэта, мая ненаглядная Случчына,
На тысячы міль засталося ўбаку.

І я нездарма падышоў з твае рошчыны,
Спякоты зазнаў і стрываў халады.
Цябе мне даволі, ніяк не зайздрошчу я
Краінам, што вечна зяленяць сады.

На лес небагата, на воды няшчодрая,
А нетры ўзбудзіла і – рынула соль,
І маеш яшчэ ты багацце нязводнае –
Высокае мора людскіх галасоў.

І колькі ні ёсць нас, малыя і сталыя,
Раскіданы ў свеце, далёка жывём, –
Імя тваё ўчуем – і ўсім заспявалася,
І дзверы адчынены кожнаму ў дом.

## СЛУЧЧЫНЕ

**Надзея Мароз**

Жытнёва-светлы, мой мядовы край!
З маленства зведала тваю любоў, пяшчоту.
Ты – маіх мрояў непаўторны май,
Маіх надзей шчаслівых асалода.

На Случчыне цудоўны дзень вясны
Бадзёрыць кроў. І сэрца ўдалеч рвецца.
Як добра быць сягоння маладым,
І ў светлы лёс сваёй краіны верыць.

Як добра адчуваць, што ты жывеш
Сярод людзей працоўных і сумленных.
Што правільнай дарогай ты ідзеш,
З якой не збочыць наша пакаленне.

Таму сягоння голас аддаю
За Беларусь, за Случчыну... За шчасце.
Цябе, мой край, бязмежна я люблю,
І ў гэтым не саромлюся прызнацца.

Квітней, мой край, заўсёды маладзей!
Хай вёсны над табою пралятаюць!
Да дзён шчаслівых, радасных падзей
Няхай хутчэй яны нас прыбліжаюць!

## СЛУЦКІ КРАЙ

**Лілія Матусевіч**

Які цудоўны Слуцкі край–
Ля кожнай хаты сад, як рай
Мяне прывёз Кахання птах –
Румяны яблычкі ў вачах!

Тут птушкі з лесу – дзіўны пёркі!
Ды ў садзе – вожыкі, вавёркі...
Сады дрымучыя – палоскай,
Прыгожа акаймляюць вёскі!

Пладоў тут пекныя сарты,
Усё частаваў муж малады.
Прыехалі пасля вяселля,
У маці агарод – без зелля!

Зямля чарнютка; усё буяе!
Такога ў Мінску я не знаю.
Гарбуз вялізны – будзе з пуд!
Бурак і рэдзька – проста цуд!

Ну, хоць вязі іх на выставы –
Вялізны дзіўны, як праява.
За полем – поплаў, кветкі лотаць;
Я ў цёпленькай вадзіцы – плёхаць!

Падалей – джунглі кукурузы –
Высокі. Я там – карапузам.
Схавалася. Гукае Віця...
Кукую я – хачу дражніцца.

– Выходзь! Уюноў лавіць у балоце!
– Цікава! А там будзе лотаць?
Там кветак мора залатое.
Дык жыць давай тут на прасторы!

Такі цудоўны Слуцкі край.
Жыві сто год! Не памірай!

## СЛУТЧИНА

**Екатерина Мед**

О, Слутчина моя!
Ты – соловьиный край,
Край красоты, великолепия.
Полно, через край!
И не изменяют этот край столетия.

Анастасия Слуцкая свободу отстояла,
Не дала, Слуцк, тебя поработить.
София же Слуцкая так православие
Старалась, защищала.
И как же, Слутчина, тебя нам не любить!

## МАЙМУ СЛАЎНАМУ ГОРАДУ

**Ганна Міклашэвіч**

Мой слаўны горад, зноўку ты цвіцеш
Аздоблен працавітымі рукамі
Табе мой шчыры і натхнёны верш
Ты жыў і будзеш жыць вякамі.
Ты сёння прыгажэеш на вачах:
Гамоняць рэхам слуцкія завулкі,
Прыемна нос казыча смачны пах
Каўбаскі слуцкай, свежай здобнай булкі.
Твой гонар і сумленне – землякі
Шчыруюць дбайна на палях радзімы
Вядомыя ў свеце слуцакі
Народ свой славяць родны і адзіны.
Жыццё віруе ў школах і садках
З дзіцячым смехам горад маладзее
Тут талентам адкрыты светлы шлях

У моладзь наша вера і надзея.
Сафію мудрую шануюць землякі
Ім слуцкі пояс блізкі і знаёмы
І храмы, перажыўшыя вякі
Ўслаўляюць верай шчыраю, нястомнай.
Мой мілы Слуцк, у засені бяроз,
Па берагах Случы шумяць ракіты...
Удзячна, што з табою звёў нас лёс.
Табе мая любоў, мая малітва...

## СЛУЦКАМУ КРАЮ

**Ганна Міклашэвіч**

Зямля мая, пад небам сінявокім
Красуешся і вабіш чысцінёй.
Чаруюць лёгкакрылыя аблокі...
Маё натхненне ты і гонар мой.
О, як багата колераў і красак –
І акрыляе думак маладосць.
Душы маёй і сэрца абавязак
Любіць і славіць гэту прыгажосць.
Твае палі, лугі і пералескі
Гукаюць – я шчаслівая бягу.
Так без прастораў сумна мне і цесна,
Яны разгоняць горыч і тугу.
Грыбы, суніцы, спелыя ажыны,
Тваіх лясоў багацце не злічыць,
Бярозы стройныя і юныя рабіны,
Мне без зямелькі роднай не пражыць...
І я жыву з надзеяй і любоўю,
З падзякай за бязмежны рай.
Душа мая напоўнена табою,
Мой ненаглядны Слуцкі край.

## СЛУЧЧЫНЕ

**Зоя Падліпская**

Я нізка пакланюся той зямлі,
Дзе першы крок свой некалі ступіла.
Дзе слёзы барвінкамі прараслі
Праз вечны боль — матуліну магілу.
Дзе боль і радасць у адным вянку
Спляталіся у дзіўны час вясновы.
Шчыміць душа — сасмяглую раку,
Як і раней, лічу жыцця асновай.
Тут родныя трымаюць карані
І салаўі спяваюць гэтак дзіўна.
Мой лёс, прашу, мяне абарані,
Не дай чужою стацца на радзіме.
Куды б мяне дарогі ні вялі,
Я з кожным днём, як з кожным новым вершам,
Ўсім сэрцам прырастаю да зямлі,
Дзе некалі зрабіла крок свой першы.

## АЙЧЫНА

**Зоя Падліпская**

Да болю родная зямля,
Лугі і пералескі.
І шэпт ляснога ручая,
І ўсмешка першае пралескі.
І зорак вечных карагод
У шчодрым небе.
І працавітых душ узлёт
У лусце хлеба.

Сюды вяртаюся з дарог.
І ёсць прычына:
Паходняй свеціць мне здалёк
Мая Айчына.

## МОЙ ГОРОД

**Наталья Падольская**

Мой древний белорусский городок!
Ничто твое затишье не тревожит:
Ни шум трамваев, ни людской поток,
Ни улиц разных тайная несхожесть.

Ты весь как на ладони, на виду.
Зеленая, Лесная, Полевая...
И я, закрыв глаза, пешком могу
Пройти тебя от края и до края.

Мой милый неизвестный городок!
К твоим сединам снова обращаюсь.
И как бы ни встречал чужой порог,
Я вновь и вновь к родному возвращаюсь.

Ты синей птицей детства моего
В далеком неумелом танце кружишь.
И нет на свете больше ничего,
Чем счастье знать, что ты со мною дружишь.

Встречаешь, провожаешь в сотый раз,
По доброте своей всегда прощаешь.
И свет твой чистый в сердце не угас,
И ты меня как прежде понимаешь.

Родной мой Слуцк, любимый городок!
Я счастлива, что ты на свете есть.
К тебе ведут сплетенья всех дорог,
И где б я ни была – я сердцем здесь.

## МОЙ ГОРАД

**Іна Падскробышава**

Мой горад, як неба, і светлы,
Тут столькі мне шчасця дарыла дзяцінства.
Усім сэрцам люблю я яго і цаню –
Мой Слуцк старажытны, радзіму маю!

Мой горад гісторыяй вельмі багаты.
Праславілі слуцк паясамі дзяўчаты.
Іх можна ў розных краінах убачыць –
Такі непаўторны ўзор тае працы.
У ліхія гадзіны мой Слуцк не скарыўся.
Змагаўся і з попелу ён адрадзіўся.
І сёння дае яму новыя сілы
Заступніца наша – святая Сафія!

## РОДНОМУ ГОРОДУ

**Пётр Петрович**

София Слуцкая молилась,
Восхваляя Слуцкий край.
День и ночь она трудилась,
Превращая город в рай.

Тебя воспевали в эпохах,
Ты центром культуры всей был.
Теперь же, воздвигнутый Богом,
Ты нами, случчанами, чтим.

Наш родной, красивый, гордый
И великий, и любим.
Сообща тебя возвысим
И навеки сохраним.

## МОЙ СЛУЦК

**Иван Простак**

Словно россыпь самоцветов,
Древний Слуцк зажег огни.
Разноцветным, ярким светом
Манят нас к себе они.
Вправе я тобой гордиться,
Пусть звучит от сердца стих,
Как легенда, как страница
В книгах прадедов моих.
Город – труженик и воин,
Древний ты и молодой.
Расцветай и будь достоин
Нашей славы трудовой.

***

**Рыгор Родчанка**

Табе кляліся ў любві паэты.
Ты вершамі апетая не раз.
Паэмы доўгія і сціслыя санеты,
Як снег, цярусіць на цябе Парнас.

Я рады, што завуся тваім сынам,
Пра большае не стану гаварыць,
Але адно я ўсё ж сказаць павінен:
«Хто любіць, той маўчыць».

## ПРА СЛУЦКІ РАЙ

**Рыгор Родчанка**

Хто хоча з вас, сябры, у рай,
хай едзе ў наш Случчанскі край.
Яму пакажуць тут дзяды
ўсе нашы райскія сады.
Пакажуць лес і гмахі-дрэвы,
пакажуць грушы-дулі, бэры,
якіх няма і ў раі.
Пакажуць роўныя палі,
Пакажуць пералескі, рэчкі,
пакажуць поле белай грэчкі.
Пакажуць роўнядзь, як далоні,
што зачароўвала Антоні,
Калі ён да Хадыкі ехаў
купляць зямлю з Міхалам-братам.

Пакажуць поле без агрэхаў,
накормяць і дадуць прысмакаў.
Пакажуць вырабы з жалеза:
патэльні, вілы, чыгункі
і пачастуюць мёдам свежым.
Пакажуць вырабы з мукі,
пакажуць соль у Салігорску,
пакажуць новую вам вёску.
Дзіка пакажуць і ласіху,
карову з хату (рэкардзіху).
Пакажуць ракаў на паўпуда,
Шмат розных іншых дзіваў, цудаў.
Хто хоча з вас, сябры, у рай,
хай едзе ў наш Случчанскі край.

## СЛУЧЧЫНА

**Аляксей Русецкі**

Кажуць,
жыў манах, што страціў веру
у святыя райскія плады,
сам, на зайздрасць богу, вывеў бэру
і пусціў у слуцкія сады.
Кажуць, што тады ў няволі
ткалі чарадзейкі ў князя пры двары
паясы-палосы, што здзіўлялі
харaством Варшаву і Парыж.

І цяпер узоры шоўкам ткуцца,
грушы спеюць,
хмель паўзе да сцен;
зіхаціць асфальтам горад Слуцак —
прамысловы, з пеўнямі, райцэнтр.

Паважаюць яго славу, годнасць
гарадкі наўкольныя
ды ў знак
свае ласкі і сябе ахвотна
называюць слуцкімі здаўна.

Залатою слуцкай хваляй жыта
у палях плыве наўкола іх,
і такія ж сёлы там, нібыта
векавыя цёмныя гаі.

І такія ж ёсць прамкамбінаты
з пасмай дыму ў гэтых гарадках,
быў бы цэх мастацкі, дык дзяўчаты
нават майскі луг маглі б саткаць.

Случчына!
Твой хлеб, узор шаўковы
і сады вядомы ўсім твае,
але ты нязвычна, ў славе новай
перад светам сёння паўстаеш.
У тваёй гаворцы загучалі,
назаўжды ў твой побыт увайшлі
станцыя з адметнай назвай — Калій,
Салігорск, што вырас на раллі.

Па-над ім шахцёрскай долі зоры
на капрах і ноч, і дзень гараць,
з нетраў цёмных першыя шахцёры
соль тваю ўзнімаюць на-гара.

паклоніцца на полі
наш вусаты дзядзька-ураджай;
і да хлеба ты дасі шмат солі,
Случчына — гарняцкі новы край.

Загулі дарогі ў іншым рытме,
зрушаны глыбокія пласты...
Дый цяпер
так працавацьмем, жыцьмем,
каб наўкол —
наўкол цвілі сады.

**СЛУЦК**

**Светлана Р.**

Софии Слуцкой щедрая земля,
Просторы и бескрайние поля.
Прославленная чудо-поясами,
Такая ты одна под небесами.
Тобой одной не налюбуюсь я,
О, Случчина, прекрасная моя!

**СА СВЯТАМ, СЛУЦК!**
**Любоў Семяновіч (Ануфрэйчык)**

Шумяць стагоддзі над Вялікай Горкай.
Прыслухайся: у гомане Случы
Паданняў таямнічая гаворка –
Так шэпчуцца крыніцы ўначы.

Крыніца-Даўніна журчыць пра першы
Шаўковы пояс, вытканы з душой.
Крыніца-Лірыка пяе пра вершы,
Народжаныя на зямлі святой.

Крыніца-Працаўніца каравай
Расхваліць на квяцістых ручніках.
Крыніца-Радасць песні ўспамінае,
І рэхам смех збягае па мастках.

Крынічкі – як маленькія салюты.
І кожная па-свойму зіхаціць.
Ды толькі з іх адна, крыніца-Смутак,
Бязгучна плача, стоена маўчыць.

Прыгадваюцца вобразы і даты.
А сёння дзень для радасных падзей:
Шаноўныя сябры мае, са святам!
Са святам, горад спраўджаных надзей!

Каб расцвітаў мой старажытны горад,
Пад ногі безліч кветак сыпаў май,
Усявышняга прашу: «Ад слёз і гора
Край любы ўратуй і захавай».

Шумяць стагоддзі над Вялікай Горкай,
Звіняць світанкі, песцяцца сады.
І тчэцца лёс і зоркавы, і горкі,
А родны Слуцк – заўсёды малады.

## НАШ ГОРОД

**Владимир Ситкевич**

В прошлом здесь военный был поселок,
Окруженный множеством болот.
А теперь на этом месте город
В мирных буднях шириться, растет.

Меньше стало ям, канав глубоких,
Вместо них – чудесные дома.
И растут на улицах широких
Для людей жилые корпуса.

И растут постройки светлых зданий
На глазах простых наших людей.
Честь вам всем, строители - случчане,
За ваш труд, любовь к стране своей.

Не узнать сегодня древний город
В зелени деревьев и в цветах.
С давних пор он стал для нас всех дорог,
Как солдат, прославившись в боях.

Пусть шумят дожди порой холодной,
И встает стеной туман густой.
Нам не помешает злость погоды
Строить города в стране родной.

Так расти, цвети под небом синим,
Будь гостеприимным, как всегда,
Солнцем озаренный негасимым
Город Слуцк республики труда.

***

**Лявон Случанін**

Добры дзень, незабыўны Слуцк –
Мілы горад маёй маладосці!
Чвэртку веку аддаўшы злу,
Да цябе прыкурэў я ў госці.
Вырас ты за разлукі гады,
Раздаліся твае памеры,
Толькі кепска бярог сады
І славутыя слуцкія бэры.
Толькі ў парку да ранняй зары
Вечарам вольным веснім,
Дзе любяць гуляць малады і стары,
Чуюцца рэдка Случчыны песні.
Толькі вякі на сабе несучы,
Перамагаючы ліха і гора,
Ты не дагледзіў сястрыцы Случы,
Што старыцай стане скора.
І ўсё ж я люблю цябе, Слуцк –
Векавечная гордасць краю!
Толькі больш паддавацца злу
І манерам чужым не раю!
Ты жывеш амаль дзевяць вякоў
І, будучы часта падданым,
Вырываўся з чужых акоў,
Заставаўся Радзіме адданым!

## МОЙ ГОРОД

**Светлана Трофимова**

Мой маленький город в объятья зимы
Отдаться готов без сомнений и страха,
Ажурной резьбой над рекою мосты
Раскинули крылья, как черная птаха.

Мой маленький город простужен, устал,
И кашляют трубы клубами из дыма.
Пятном желто-синим маячит вокзал,
Но я остаюсь, проходя снова мимо.

Мой маленький город ветрами пропах,
Они мне надежду вселяют и веру.
Мы счастья не ищем в заморских местах,
Свет солнца мы ловим здесь, в маленьких скверах.

Мой маленький город, невзгод не боясь,
Раскроет слутчанам скупые объятья.
Я с городом эти стихами слилась,
Познав здесь иллюзию полного счастья.

## СЛУЦКИЕ ЭТЮДЫ

**Светлана Трофимова**

Я вспоминаю слуцкие этюды
В чужой, далекой стороне:
Дома разбросаны повсюду
И мост чугунный на реке.
Тона пастельны, изумрудны,
Шары ночные фонарей.
Все очень скромно. Не забуду
Я гавань пристани моей.
И, где б я ни была, как в чудо,
Спешу в тот город на Случи,
Он утешает, если трудно,
Он вдохновляет: «Напиши!...».
Нас парк доверчиво встречает,
Воркует стая голубей,
В объятья тихо заключает
Слуцк – город пристани моей.
И сердце замирает, если
Знакомых лиц увижу свет,
Я слышу мелодичность песни,
Звучавшей в Слуцке сотни лет.
И слово «здравствуй» без пристрастья,
И легкий головы кивок...
Во мне живут любовь и счастье,
Мне в Слуцке сладок каждый вздох.
Я благодарна всем  на свете
За этот город над рекой!
Ведь в нем родились наши дети
И наша светлая любовь!

***

**Таіса Трафімава**

«Слуцкаму краю» прысвячаю
Маё паэтычнае слова,
Маё віншавальнае слова,
Маё прывітальнае слова!
Ад крыніц,
Ад зямлі,
Ад сям’і
Яго карані.
Словы лашчылі слых
З вуснаў бацькі і маці
З той пары,
Як мы босыя бегалі ў хаце.
З цягам часу адкрыліся сэрцы для слоў,
Палымяных, напеўных, высокіх і простых,
Трапяткіх, сакавітых і хлебных, і росных,
Паэтычных, узвышаных слоў-вестуноў.
З цягам часу адкрыліся сэрцы для слоў…

## АДНА ЗЯМЛЯ

**Таіса Трафімава**

Зямля бацькоў - цудоўная зямля!
Пашчасціла і мне тут нарадзіцца.
Да скону дзён і зблізку і здаля
Табою, любы край, мне ганарыцца.

Адна зямля ў нас з табой, адна!
Дае нам сілы чыстая крыніца,
Куды б мяне дарога ні вяла,
Табе жадаю нізка пакланіцца!

Мой край рамонкаў, сініх василькоў,
Тут плакаць і смяяцца можна ўволю,
Тут сустракаюць дарагіх сяброў
І песняй звонкаю, і хлебам-соллю.

Я рада зноў вярнуцца ў родны дом.
Сустрэнуць тут бярозы і таполі.
Пакуль гарыць рабіна пад акном,
Маленства казку не забыць ніколі!

## СЛУЧЧЫНЕ

**Таісія Трафімава**

Уцякаю ад горада,
Кніг, пісаніны —
Вабяць рэчка і лес
Незабыўнай мясціны.

Слухаць вельмі люблю
Гоман птушак пявучых.
Толькі тут я жыву,
Тут п'ю водар гаючы.

Тут на поўныя грудзі
Паветра ўдыхаю,
Да крынічкі ў лузе
Я зноў прыпадаю.

Маладзею душой.
Просяць крылы палёту,
Дзякуй, кут родны мой, —
Я гатова да ўзлёту...

## СЛУЧЧЫНЕ

**Таісія Трафімава**

Моц мая,
Сіла мая,
Краса мая,

Багацце маё –
У прасветленай любові да цябе,
Мая Бацькаўшчына!

Ганаруся тваёй велічнаю славаю,
Мая Айчына!
Прыпадаю да цябе,
Зямля мая,
Узвышанай думкай,
Святою праўдай
І шчырай самаадданасцю!

## СЛУЧЧАНСКІ КРАЙ

**Ніна Фралова**

Случчанскі край, радзімы край,
Табой я ганаруся.
Мацней гармонік заіграй
І песня ўдаль імчыся.

Сустрэнь, вясна, усход хлябоў,
А лета – поўны колас.
Багаты стол тваіх дароў –
рацоўнай славы голас.

Кранецца раніцай усход,
І сонца заіграе.
Случчанскі працавіты род
Краіна ўся пазнае.

І ветрык песні разнясе
Праз рэкі і паляны,
І гонар працы ўзнясе
Пах хлеба, пах духмяны.

Чаруе песня вечар зноў,
Працаўніка вітае.
Шчаслівых дзён, спакойных сноў
Табе твой край жадае.

## ЛЮБЛЮ ЦЯБЕ, МОЙ РОДНЫ КРАЙ

**Генадзь Харжэўскі**

Дзе б я ні быў, далёка або блізка,
Тут праязджаючы, схіляюся я нізка,
Мой родны Слуцк, мая калыска,
Мая радзіма – Слуцкая зямля...

Ты з поплавам,
Што ў вясновым лузе,
Дзе так квітнее лотаць ля ракі,
Ды з вёскаю, дзе помняць мяне людзі,
Шаноўныя мае вы землякі.

З дзяцінствам, з хатаю бацькоўскай,
Куды ўранні промень сонца зазіраў,
Са школаю, са спрэчкамі сяброўскімі,
Дзе ўсіх званок за парты заклікаў.

З настаўніцай, што словы мае першыя
Па літарах вучыла прачытаць,
З гадамі стануць словы тыя вершамі,
Дзе я з натхненнем буду рыфмаваць.

Дзе ж вы, мае пражытыя гады?
У які ўжо раз звяртаюся назад,
Маё юнацтва, бацька малады,
У ружовым квецці стаіць яблынь сад.

Півоні куст ля хаты пад акном
Сваёю прыгажосцю захапляе,
Дзяўчыне сінявокай юнаком
Нясу півоню, як царыцу мая.

Люблю цябе, мой край,
Зноў май,
І на дзявочыя далоні
Працягне хтосьці з юнакоў
Чырвоныя півоні.

* * *

**Мікола Хведаровіч**

Прастораў тваіх не абыдзеш квяцістых.
Пад небам, пад сонцам, вясною і ўлетку
Гамоняць сады над імшой прамяністай,
Чароўная Случчына, весняя кветка.

## СЛУЦК НАШ РОДНЫ!

**Юзэфа Цыбулька-Тукай**

Слуцк – гарадок мой ціхі, утульны,
Ззяеш у яркіх агнях праз гады.
Я з табою – і ў свята, і ў будні.
Працай славяць цябе жыхары,
Горад родны над Случчу-ракою.
Горад легендаў мінулых вякоў.
Ціхі гоман чароту з вярбою,
Казкі, паданні і песні дзядоў.
Званы царквы ўжо клічуць на свята,
І раніцай зноўку сонца ўстае.
І хто працуе, той жыве багата.
Мой родны горад, я люблю цябе.

## УНУКУ

**Мікалай Хілько**

Каля слуцкай гімназіі суцішу крок:
Вучыліся дзеці мае тут, зараз – унукі!
Любіў Радзівіл свой родны куток,
Таму й збудаваў гэты храм навукі.

Стаіць над Случчу ён ужо вякі,
Храм, узведзены з любоўю,
Ганарацца вельмі ім слуцакі,
Як і Случчынай – роднай зямлёю.

Ганарыцца важна зямлёй і любіць
Край, дзе нарадзіўся і вырас.
Ды трэба, як князь, для Радзімы штосьці зрабіць, –
Запомні, унук, гэты выраз.

Напроста храм збудаваць на вякі.
Радзівіл жа наперад ведаў,
Што будуць вучыцца тут слуцакі,
Якім пакарыцца неба.

Нашчадак Косберга ты, юнак,
І ты даляціш да зораў.
І зноў нехта здзівіцца: Ілья Кулак?!
Ён жа са слуцкіх прастораў.

У храмах, садах зямля прыгажэй.
Случчына – храм прыгажосці.
Няма нічога за край твой мілей.
Вяртайся сюды не госцем!

## СЛУЧЧАНКА

**Мікалай Хілько**

Ці княжна? Ці царэўна?
Не. Случчанка мая.
Ты, як радасць світання,
Нада мной узышла.

Прыгажэйшай жанчыны
Мо, не бачыў увесь свет.
Нездарма Багдановіч
Прысвяціў свой санет.

Тым прыгожым дзяўчатам,
Ткалі што паясы.
І Сафіям і Настам –
Яны ў Слуцку ўзраслі.

Хай з-пад Мінска ты едзеш,
Ці няхай з Капыля,
А случчанку ўгледзіш –
Назаўсёды твая.

Так сабой заварожыць –
Застанешся на век.
Ты – яе спадарожнік,
Родны ёй чалавек.

Ноч праходзіць. Світанне.
Зноў у Слуцку вясна.
Ты – мая ненаглядка!
Каралеўна мая!

## ГОРАД ЛЕГЕНД

**Кастусь Цыбульскі**

Плыве над Слуцкам тапаліны пух,
І смех дзяцей, і песні на радзінах.
Сафіі Слуцкай неўміручы дух,
Зачараваны клёкатам бусліным.
Горад, майго кахання горад,
Маіх трывог і спадзяванняў сны…
Продкаў мовaю гаворaць
Тут вуліцы, і клёны, і дамы.

З легендаў старажытная зямля,
Дзе Случ блакітнавокая віецца,
Калі сюды вяртаешся здаля,
У хваляванні доўга б’ецца сэрца.
Сумленны і спагадлівы народ
Жыве адной руплівая сям'ёю.
Чацвёрты кожны ў сорак першы год
Апалены далёкаю вайною.

## СЛУЦКАЯ ЛАЗНЯ

**Кастусь Цыбульскі**

У слуцкай лазні пахне спелым дубам
І маладым бярозавым лістом.
Калі ад пары венікі усчубяць,
З палка, браток, не упадзі пластом.

Тут пахне півам, што свярбіць у роце.
Трашчаць сухія плоткі, шчупакі,
Раяцца каля столікаў у поце
Чырвоныя ад пары слуцакі.

Гамонка тут, нібы на Камароўцы,
Пра Польшчу, пра палітыку ў вярхах.
Народнае падсоленае слоўца
Смакуецца на вострых языках.

Пачуеш тут пра бойкі і здарэнні...
Інтым для слуцкай лазні — навіна!
«Яго ў машыне бачыў... без адзення,
Ды разам з ім была... яна...»

У рогаце — пра Пецьку анекдоты,
У слёзах — успамін франтавікоў.
Тут лечацца хваробы і згрызоты,
Тут пераблытана з нядзеляю субота
І піва ў куфлях пеніцца ізноў.

...У слуцкай лазні пахне спелым дубам,
Духмяністым бярозавым лістом.
Калі ад пары венікі усчубяць,
З палка, браток, не упадзі пластом.

## МОЙ ГОРАД

**Сяргей Шабалін**

Я памятаю - раз пачуў паданне
Старой мінуўшчыны, даўно прайшоўшых дзён
На месцы, дзе стаіць наш родны горад,
Былі бары, балоты, буралом.
Аднойчы князь, вялікі і вяльможны
Адправіўся на паляванне ў лес.
Ён на кані скакаў - што вецер не дагоніць
Ён мужны быў, ён быў кароль тых месц.
Але ж бяда з ім здарылася раптам,
Ягоны конь ну быццам ашалеў.
Устаўшы на дыбы, ён скінуў князя
І як маланка прэч ён паляцеў.
Князь раззлаваўся, але ўстаць не можа,
Зламаная нага, ой як баліць!
Не будзе палявання, шкода справы,
Засумаваў, ну, што ж цяпер рабіць?
Навокал аглядзеўся, а ў акрузе
Прыроды хараство, жыцця краса,

Бор векавы шуміць, рака віецца,
Над хвоямі - нябёсаў глыбіня.
І вырашыў ён заснаваць тут горад,
У знак здарэння гэтага назваць
Случэскам, што значыцца - выпадак,
І будзе ён тут праз вякі стаяць.
Прайшлі гады, амаль тысячагоддзе
Стаіць і зараз горад на Случы.
Хай невялікі, але ж так прыгожы
Горад бацькоў, горад маёй любві.

## МАЯ СЛУЧЧЫНА

**Настасся Шкудун**

Нішто не вабіць так,
Ні водбліскі мораў,
Ні гарады чужыя
Ні замкі цароў,
Як мілая, родная сэрцу мясціна,
Дзе пяе слаўны птах,
Дзе радзіма бацькоў,
Дзе гучаць калыханкі,
Дзе хата мая,
Дзе матуля жыве,
Дзе Случ серабрыцца, крынічкі ліюцца,
Дзе людзі на гора заўжды адгукнуцца,
Дзе лясы ахінаюць спакоем і цішай,
Дзе абшары палёў ледзьве ветрык калыша,
Дзе зямля мая потам, крывёю паліта,
Дзе народ працавіты,
Дзе ў высі блакіту
Белы бусел плануе

Павольна, адкрыта –
Гэта ўсё мая Случчына,
Край, што мне мілы.
Ты радзіма, якой
Ганаруся я шчыра!

## МОЙ РОДНЫ КУТ

**Пётр Шуляк**

Едуць людзі ў розныя бакі:
Хто шукае мару, хто – туманы,
Хто імчыць за подыхам тайгі,
Распіхаўшы рэчы ў чамаданы.

Кідаў лёс па свету і мяне,
Чорных хмар парыў насіў усюды.
Толькі ў далёкай старане
Быў заўсёды я, як па прысуду.

Прыгажосць сталіцы, гарады,
Яркі бляск вясёлкавых неёнаў…
Я ж к табе прыпісан назаўжды,
Я ў цябе, мой родны Слуцк, улюблёны.

# ЗА РОДНЫ КРАЙ

## 14 ПАРТЫЗАН

**Г. Гапановіч**

Узыходзіць сонца яблыкам агністым,
Палыхае сцягам сіні небасхіл.
Чатырнаццаць слуцкіх партызан-герояў
Баранілі край свой да апошніх сіл.

Закавалі юных ворагі ў кайданы –
Наступіла цемра панскай дабраты.
Мужнымі стаялі на світанку хлопцы.
Песню «Варшавянка» завялі браты.

Паляцела песня ды па наваколлю,
Узнялося сонца ў ласкавы зеніт.
Чатырнаццаць слуцкіх партызан-герояў
На вякі зліліся ў памятны граніт.

Адгрымелі годы цемры і навалы,
Залячылі мноства мы крывавых ран,
Але сэрцам нашым мы не забываем
Пра геройскі подзвіг слуцкіх партызан.

Расцвіла гваздзіка на магіле брацкай –
Гэта квецік міру, квецік дарагі.
Ім спяваюць песню людзі добрай волі,
Ім спяваюць песню Случы берагі.

## БЕРЕГИТЕ СВЯТЫНЮ

**Петр Девятериков**

Сегодня, товарищи,
В праздник Победы,
Подводим итоги
Второй мировой.
Его не затмят
Наши общие беды,
Для многих народов
Он факел святой.

Люди стоят
У могил, обелисков,
Скорбят вспоминая
Отцов и дедов.
Поклон им от нас
Благодарственно низкий,
И вечная память
Случчан-земляков.

Были герои
В боях и походах,
Пули, как осы,
Кусали не раз.
Мы живы сегодня,
Их нет уже годы,
Погибли в войну
За Отчизну, за нас.

Горло и сердце
Сжимается в спазмах,
Скупая слеза
Обжигает щеку.
Когда ветеран
Выступает с рассказом,
Читает поэт Золотую строку.

Многих коснулись
Военные беды,
На фронте, в тылу,
В партизанских лесах,
Храните святыню —
Знамя Победы,
Пусть вечный огонь
Славит павших века!

## НА ЗАДАННЕ

**Мікола Жук**

Вось і Случ. І вербы над ракою,
Птушкі ў поймах жаласна крычаць…
Родная краіна, над табою –
Змрок начы!

І такое цёмнай - не разгоніць
Нават сонца цяжкі яе змрок.
Хвалі Случы сумнае мне звоняць.
Горад змоўк.

Хмурным стаў. Усе песні адгучалі
У чаканні жудасных трывог,
Толькі тоны гібельнае сталі
Душаць шыр дарог.

Даль дарог, што на Усход сягаюць,
Запруджаюць тысячы машын.
Чым далей паўзе арда сляпая –
Ноч цямней, святлейшы ўспамін.

Сцежачкі на Случчыне любімай
Помню, знаю, адшукаю ўсе.
Мне здаецца: дзеўчына падыме
Жыта сноп ў ранішняй расе.

Будуць гнуцца жнеі стройным станам
Над багаццямі калгасных ніў...
Мне здаецца: на лясных палянах
Свецяць піянерскія кастры.

## НАД РАКОЮ СЛУЧ

**Мікола Жук**

Як у люстра горада руіны
Дзень і ноч ў твае глядзяцца хвалі.
Здрыгануў удар маю краіну,
Але мы пад бурай устаялі.

Тры гады ў ворага быў Слуцак,
Рэчка Случ была чужой і хмурай.
Слухаў я, дзе нашы мужна б’юцца,
Дзе агнём смяротным выюць буры.

Я хадзіў балотамі Палесся,
А пад Слуцак падкрадаўся ноччу,
Мае мары расцвіталі ў лесе,
Каб пасля пад Слуцак з гневам крочыць.

Злых гадзюк я загубіў нямала,
Быў Радзіме я адданым сынам.
Мая куля там іх насцігала,
Дзе яны не думалі загінуць.

Сёння ты свабодны, горад любы,
Днём вясновым Перамогу славім.
І цалуюць прагна мае губы
Пыл руін, што рвуцца к новай славе.

Хутка ты залечыш свае раны,
Камяніцы гордыя ўздымеш,
Каб цвіла магутная Радзіма,
Што навек знічтожыла тыранаўю.

*9 мая 1945 г.*

## ГОРАДУ СЛУЦКУ

**Мікола Жук**

Хай ляжыш ты сёння ў руінах,
Не саромся дзікіх пустыроў:
Мы падымем кожную цагліну,
Адбудуем мы цябе ізноў.

Толькі не забудзем мы ніколі,
Колькі перанёс ты цяжкіх ран,
І як грозна біліся за волю
Сотні мужных слуцкіх партызан.

Як яны пажарам азаралі
Людаедаў неспакойны сон,
Як цярпліва ўсе яны чакалі
Гэтых светлых і вялікіх дзён.

Разам сёння справім гадавіну,
Не спраўлялі мы яшчэ якой,
Успомнім тых, што палі за краіну
І якія спяць у зямлі сырой.

Убярэм вянкамі іх магілы,
Вунь яны - на плошчах на тваіх.
Мужнымі Радзіма іх узрасціла
І вяла ў грозныя баі.

Не саромся ж ты сваіх руінаў,
Не саромся дзікіх пустыроў
Мы падымем кожную цагліну,
Адбудуем мы цябе ізноў.

## ЧАТЫРНАЦЦАЦЬ СЛУЦКІХ ПАРТЫЗАН

**Андрэй Лешчанка**

Патанулі ў дыме веснавыя далі,
Родны край імглою апавіў туман.
За Радзіму-маці сэрцы аддавалі
Чатырнаццаць слаўных слуцкіх партызан.

Узнялася ціха баявая песня,
Яе горда слухаў навакольны люд.
Чужаніца люты над магілай цеснай
Прачытаў паўстанцам свой ліхі прысуд.

Вы не плачце горка, родныя матулі:
Як арлы, стаялі мужныя сыны;
Родныя прасторы бачылі і чулі:
Білі па-геройску ворагаў яны.

Ведае Айчына пра сыноў адданых,
На магіле помнік памяць апячэ.
Услаўляюць песні слуцкіх партызанаў,
Ды ў матулі слёзы на шчацэ...

## ЗА РОДНЫ КРАЙ

**Любоў Семяновіч (Ануфрэйчык)**

Сустрэла перамога на мяжы
Паміж жыццём і смерцю, сном і болем.
Здаецца, паміраў ён, але жыў
І трызніў, што пяе жаўрук над полем.

Над выгаралым полем, дзе чарней
Ад сажы жыта ў месіве крывавым.
Над лугавінай, дзе малых дзяцей
Расой аплачуць стоптаныя травы.

Смяяўся, плакаў, песню ўспамінаў,
Што абарвалася ў баі смяротным.
–Яшчэ мы паваюем, старына, –
Шаптаў праз боль яму ў шпіталі ротны, –

За песню жаўрука, за родны край,
За светлую дзіцячую ўсмешку,
За ноч і дзень, і спелы каравай,
І кожную травінку на ўзмежку,

Узараную разорамі маршчын
Стамлёнасць і цяпло рук мацярынскіх.
Каб жыць далей і помніць, берагчы
Свет мірнага, шчаслівага дзяцінства.

## У ПЕРАХОДАХ

**Любоў Семяновіч (Ануфрэйчык)**

Над Пераходамі не чутна крыкаў.
І я сюды прыходжу памаўчаць.
Зноў снілася – з агню матулю клікаў
Да хрыпаты, але не чула маці.

Матулечка мая, нясцерпным болем
Баліць мне смерць твая ўсё жыццё.
Душа твая бусліхаю над полем
Крыламі развявае забыццё.

Глядзі, раднулька, грэе сонца квецень.
Любіла ты, калі цвілі сады.
Так моцна мне баліць на гэтым свеце.
Так часта прыязджаю я сюды.

У Пераходах плача дождж вясновы, –
мроіцца, – з маіх дзіцячых слёз.
«Жыві, сынок», – твае, матуля, словы
Бусліха мне клякоча з-пад нябёс.

## СЁСТРЫ ХАТЫНІ

**Мацвей Стрэльчык**

Сёстры Хатыні, як'жа вас многа
На беларускай пакутнай зямлі!..
Ад іх — ані знаку, нават парога,
Куды б пагарэльцы вярнуцца маглі.
І ў Слуцкім раёне ёсць сёстры Хатыні:
Іх карнікі спалілі трыццаць шэсць.
Дванаццаць так і не аднавілі:
Пераходы, Фадзееўка, Беразінец...
Страшэнная доля людзей напаткала
Ў дзевяці слуцкіх вёсках',
ды ў адзін дзень.
Пакуль мы жывыя і помнім імёны
Замучаных, спаленых падчас вайны,
Не прыйдзе да нас вораг новы.
Я ведаю! Помню! А ты?!.

# МОЙ КРАЙ РАМОНКАЎ, СІНІХ ВАСІЛЬКОЎ

***

**Анатоль Астрэйка**

О, як вясною Случчына цвіце!
Сябры мае, прыедзьце падзівіцца.
Такой красы не знойдзеце нідзе,
Ні ў якіх там далёкіх заграніцах.

Шалеюць, з розуму збіваюць нас
Сады, нібыта векавыя пушчы.
Які там нейкі велічны Парнас,
Калі тут райскія зямныя кушчы.

Барвовасць ды блакіт, ды бель садоў
Расквецілі, нібы вясёлкай, далі,
Уся зямля са слуцкіх паясоў,
Што нашы продкі з золата саткалі.

Цвітуць на роднай Случчыне сады,
Іх пах, пчаліны гул далёка чутны.
...Я ўспамінаю даўнія гады,
Той гераічны час, той час пакутны.

Ну што ж! Даўно былое аджыло,
Ды не забыць будан парою весняй.
Садоў вясельных белае крыло
Падкажа пэўна новыя мне песні.

Цвітуць сады на Случчыне маёй,
Мядовы пах над цэлым краем вее.
Душа, зачараваная красой,
Няхай вясной
Ад радасці шалее.

## СЛУЧЬ

**Евгений Вечер**

Случь моя родная,
Как люблю тебя:
Берега речные,
Камыши ночные.

Летом ты одета
В яркие цвета.
Лилии, кувшинки
Просто красота.

Ивы наклонились
Над родной рекой.
И полны деревья
Радости речной.

Виды речки милой
Синевой блестят.
Дети искупнуться
Так и норовят.
Как люблю тебя я,
Случь моя родная.

***

**Віктар Гардзей**

Шчэбет, свіст і пошчак усю ноч —
Птушкі ў спевах, бачна, падурэлі.
Салавей у хмызняку наўзбоч
Выцінае веснавыя трэлі.
Птушка дробная, а як пяе!
Досвіткам і ўвечар людзі рады
Слухаць чараўнічыя яе
Пералівы, цёхканне, рулады.

Плаўна гук узнік — расце, расце,
Вось калена з велічальнай нотай,
Вось жальба і сум, і ўсё часцей
Чуюцца то радасць, то пяшчота.

Віртуозны тэмп жывей, жвавей...
Нарастае меладычны рокат.
Ах, які разбойнік Салавей!
Той, што ў казках свістам клаў упокат.

Хто спявае лепш — ягоны спеў
Салавей умомант пераймае.
Вызнаць славу і любоў паспеў,
Толькі дужа форсу не трымае.

Аж на край планеты па тайзе
Рассяліўся салавей усходні,
Вучыць шчодра спевам, балазе,
Не адкіне вопыт «міжнародны»!

Мілы нам з Палесся салавей,
З гэтым жарт: пяе па-паляшуцку.
Салавей з-пад Слуцка, дык музей
Салаўю сягоння ёсць у Слуцку.

Заспяваў, і фарбамі зары
Чырваніцца пералесак весні,
І мілей нам у маі вечары
З неабдымнай салаўінай песняй.

## СЛУЧЬ

**Фирс Ковалев**

Талые воды Случи –
Это признак поры пробужденья.
Всплески весел в реке средь ночи,
Помнит их не одно поколенье.
Сколько вод унесло с давних пор,
Сколько жизней они поглотили...
Были плесы и был здесь простор,
Были тайны – куда-то уплыли.
Иногда можно встретить в Случи
Серебро чешуи в мелководье.
Не гнездятся в деревьях грачи.
Грязных пятен мы видим разводья.
А когда-то по этой реке
Лодки в Киев за грузом ходили,
И карась здесь играл в камыше,
Про него уж давно все забыли.
Я прошу тебя, Случь, всколыхнись,
Крикни громче, пожалуйста, людям:
– Человек, ты вокруг оглянись,
Видишь, всю экологию губим.

## МИЛОЙ СЛУТЧИНЕ

**Константин Корнелюк**

Земли-то, собственно, кружок,
Обвитый чутким лесом,
И Случь блестит наискосок
Под ивовым  навесом...
Деревни тянутся к реке
От ягодной опушки,
И белый камень вдалеке
Отстроенной церквушки
Всю местность, всех дорог витьё
Пройти и дня хватало,
Но наглядеться на неё –
И целой жизни мало!

## КОСМОС СЛУЦКОГО КРАЯ

**Константин Корнелюк**

Отчизна пахнет мокрыми березами
И стежками росистыми в хлебах,
И сколько ни сгибается под грозами –
Все молоко парное на губах...
И сколько б мы не рвались во вселенные
Со звездами летать вперегонки,
Лишь травы на лугах обыкновенные
Излечат от космической тоски...
Нам станут бесконечностью разлуки
И сказкой – возвращение назад...
И невесомостью измученные руки
Земную тяжесть, как награду, ощутят...

## ПЕСНЯ ПРА СЛУЧ

*Жонцы Ганне Раманоўскай*

**Ф. Раманоўскі**

Воблакам, воблакам беглым дзяцінства
Хутка сплыло за рачны паварот.
Толькі ў сэрцы, як дзедаў гасцінец,
Белых лілеяў зацвіў карагод.
Срэбныя, срэбныя хвалі,
З краскаў вянкі-берагі,
Музыкай поўняцца далі –
Случ мая, край дарагі!
Чыстыя, чыстыя ціхія воды
Бацьку і дзеду люлялі чаўны,
Людзям Палесся - абранцам свабоды,
Шляхам яднання былі з даўніны.
Срэбныя, срэбныя хвалі,
З краскаў вянкі-берагі,
Музыкай поўняцца далі –
Случ мая, край дарагі!
Роснае, роснае ранне ў ракіце
Будзіць залеглыя ўсцяж туманы,
Бусел лунае ў надхмарным блакіце –
Любіць глядзецца ў плёс люстраны.
Срэбныя, срэбныя хвалі,
З краскаў вянкі-берагі,
Музыкай поўняцца далі –
Случ мая, край дарагі!
Шчасную, шчасную стрэчу з каханнем.
Ты, мая рэчанька, нам прыпасла,
Нас павянчала ў сонечным ззянні,
Сцежку жыццёвую ў кветках спляла.

Срэбныя, срэбныя хвалі,
З краскаў вянкі-берагі,
Музыкай поўняцца далі –
Случ мая, край дарагі!

## НА ГОРЦЫ БЯЗБОЖНАЙ

**Рыгор Родчанка**

Унізе стаю, ля падножжа,
гляджу і баюся дыхнуць:
на горцы Бязбожнай прыгожа
слуцкія бэры цвітуць.

Лілейнага колеру квецень
хвалюе не толькі мяне:
на горцы пад дрэвамі дзеці
паселі на мяккай траве,

галоўкі задралі ўгору
і пільна глядзяць на кветы.
Няма ў іх вочках задзёру,
святое там шмат прастаты...

Унізе стаю ля падножжа.
Гляджу і баюся дыхнуць.
На горцы Бязбожнай прыгожа
слуцкія бэры цвітуць.

## МІР-ГАРА
*(легенда)*

**Рыгор Родчанка**

З старажытных вякоў сярод слуцкіх палёў
Узвышаюцца ў неба, як здані,
Курганы, пра якія з далёкіх часоў
Даняслiся ад продкаў паданні.
Пра адзін з курганоў
(той, што хвояй аброс)
Я людзей-старажылаў распытваў.
Расказаў пра яго мне старэнькі Хвядос: –
Горка вырасла ў выніку бітваў.
Назад тысячу год
Ваяваў наш народ
За лясы і за пашу з суседам.
Бойка тая цягнулася некалькі год:
Яна маткай была ўсім бедам.
Спусташаліся сёлы, гарэлі лясы,
Гвалтавалі кабет і дзяўчатаў.
К небу дымам усё йшло, а людзей галасы
Патаналі, бо рэзаў брат брата.
Ды нарэшце ўсе тут зразумелі адно:
Што ад войнаў – ніякай карысці...
Вось тады між сабой і было рашано
Гору ўзвесці, дзе біліся калісьці.
Зброю звезлі ўсю нашы продкі, урагі:
Калясніцы, мячы, лукі, стрэлы.
Наскідалі яе аж пад неба стагі,
А наверсе ўзвялі курган цэлы...
Вечны мір заключылі яны між сабой,
А курган з тых часоў
сталі зваць Мір-Гарой.

## ВЯСНОВАЕ

**Любоў Семяновіч (Ануфрэйчык)**

Вясельным воблакам чаромха ўскрай сяла.
Кужэльным марывам пялёсткаў весні сум.
Крылатай птушкай песня паплыла
Пра дзіўную дзявочую красу.
Вянкоў квяцістых напляла,
Знайшла вясна дарогу да маёй душы.
Крамянаю зарою ўзышла
І салаўём трапеча ў цішы.

## СЛУЦКІ КРАЙ

**Любоў Семяновіч (Ануфрэйчык)**

Серабрысты дождж на мядовы луг
Завітаў, ажывіў зямлю.
Вечаровы час. Ззяе поўні круг
Над старонкай, якую люблю.

Дзе ўвосень частуюць ранетамі,
Дзе ўлетку кірмаш гаманкі.
Ганарыцца сваімі паэтамі
Гэты край праз гады, праз вякі.

Слуцкім поясам рэчка цягнецца,
Тчэ з лілеяў узор на вадзе.
Узыходзіць багіняй раніца,
У туманах купае дзень.
Дзе сябруе з дажджамі веснімі
Колас жнівеньскі, залаты,
Тут купалле сустрэне песнямі.
Застанешся тут назаўжды.

## МОЙ СВЕТЛЫ КРАЙ

**Любоў Семяновіч (Ануфрэйчык)**

Над Случчынай, апешчанай вясной,
Пасхальны звон малітваю ліецца.
Вястуе блаславенне і спакой
І абуджае стомленае сэрца.

Мой светлы край азёраў і ікон.
Асыпле восень спелыя ранеты.
Тут сніць зямля свой чабаровы сон
І час дыктуе новыя санеты.

Раздолле васільковых дываноў,
Цяпло зямлі, сабранае ўпотай,
Увасабленнем слуцкіх паясоў
Заўсёды саграе душу пяшчотай.

Іграе сонца ў юр’еўскай расе,
Цямнее далягляд з аквамарыну.
У натруджаных руках мой край нясе
Свае здабыткі ў скарбніцу Айчыны.

## ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ

**Лявон Случанін**

Шмат прыгожых мясцін на зямлі беларускай,
Яны сэрца маё пакарылі навек...
Жыў пад Гомелем я, у Дуброўне, у Глуску,
А душа мая ў Слуцку заўсёды жыве.
Я хадзіў берагамі і Случы, і Шчары,
Я купаўся у Сожы, ныраў у Дняпры,
Я аблазіў Арэсы і Пцічы гушчары,
Любаваўся на Нёман з зары да зары.
Мяне шчыра ласкалі і сонца, і зоры
І прасілі да іх маю песню ўзняць.
Мяне духам паданняў натхнялі азёры:
І Дрысвяты, і Нарач, і возера Князь.
Я пад Гродна хадзіў любавацца барамі,
І здавалася мне, што ты ў казцы жывеш.
Я знаёмы з табой і з тваімі зубрамі
Дарагая мая Белавеж!
Дзе я толькі не быў, што я толькі не бачыў,
Галаву ад павагі схіляючы ніц.
Дзе я толькі не піў летнім поўднем гарачым
Берасцяным карцом з беларускіх крыніц!
Ты заўсёды мяне сустракала, як маці:
Ці вяртаўся з вяселля, ці з горкай бяды...
Я з касою хадзіў па тваёй сенажаці,
Харчаваўся супамі з тваёй лебяды.
Ты гадуеш людзей працавітых і шчырых,
Простых з мовы, зычлівых з душы.
На прасторах тваіх люд нязможаны вырас
На суглінках з пяском і ў балотнай глушы.
У народзе тваім сілы – край непачаты:
У старанных мужчын, у прыгожых жанок.

А якія цябе аздабляюць дзяўчаты!
Варта глянуць на іх – дух займае ажно!
А люблю твае мірныя далі-палеткі,
На світанні над лесам лагоду-смугу,
Задуменнае неба, ласкавыя кветкі.
Я люблю цябе так, што забыць не магу.
Не магу без цябе на чужыне далёкай
Ні пазбыцца нуды, ні пазбыцца тугі.
Мяне цягне дадому буслоў тваіх клёкат,
Што вясною і летам вартуюць лугі.
Мяне цягне прыветная песня жаўронка,
Што струменіцца з неба на нівы, лясы.
Мяне Случчына цягне – юнацтва старонка,
Ненаглядны прасцяг сарамяжай красы.
Мяне цягнуць машын працавітых маторы
І заводаў тваіх маладыя гудкі.
Мяне цягнуць дадому лясныя прасторы,
Непачатых паэм залатыя радкі.
Мяне цягнуць прыгожыя гмахі сталіцы,
На якіх залаціцца Ярылы прыход
Мяне цягне ўсё тое, чаму пакланіцца
Я не змог на працягу 15 год.
Мяне цягне тваё залатое світанне,
Што разгоніць дакучлівы, вязкі туман,
Што абноўленым днём над Радзімаю ўстане,
Чалавечным і шчырым, як радасць сама.
Мяне цягне дадому вялікая сіла,
Ад якое эпохі пачатак бяруць.
Мяне цягне жыццё, мяне цягне магіла,
Мяне цягне дадому мая БЕЛАРУСЬ!

## НОЧ МАЛАДЗІКА

**Кастусь Цыбульскі**

Над Случчынаю — ноч маладзіка…
Трапечуць зоркі у рачных затонах,
І цуглямі звіняць на лузе коні,
Лілеямі успенена рака…
Над Случчынаю — ноч маладзіка.
Туман змывае клёны і платы,
Мяжа злучае постаці каханых,
А над зямлёй, у воблачка ўвабраны,
Усходзіць важна месяц малады.
Ад вуснаў загараецца шчака,
Арканы рук мне паланілі шыю.
Каханая, багі мае зямныя
Не ведаюць, як я цябе чакаў
У дзіўны час, у ноч маладзіка…
Начны салоўка сцішыўся на міг,
Мы удваіх пад зоркамі Сусвету.
Тваіх грудзей даспелыя ранеты
Далоняў дакранаюцца маіх.
Ад слоў тваіх хмялее галава:
«Каханы мой, ты для мяне — навекі…»
У асалодзе жмурацца павекі,
І нас прымае вобмацкам трава.
…Няхай з табою канем у вяках,
На могілках вянкі павыгараюць.
Дзве постаці сустрэнуцца за гаем
Ў тумане белым, да рукі — рука
У дзіўны час, у ноч маладзіка…

## СЛУЦКАЯ КРЫНІЧАНЬКА

**Кастусь Цыбульскі**

Напеўнымі вятрамі
І песнямі сагрэта,
Тут славяцца вякамі
Музыкі і паэты.

Тут мурагі шаўковыя,
Тут салаўі прыручаны,
Таму цябе, вясновая,
Завуць пяшчотна — Случчына.

Прапахлі збажыною
І рукі, і аблокі,
Тут весняю парою
Пяе жаўрук высока.

Крынічка-неўгамонка
Ля явара бруіцца,
Случанская старонка
Світальнай зоркай сніцца.

# ЗА ЦЯБЕ,

# МАЯ ВЁСКА,

# МАЛЮСЯ

## ВЁСАЧКА МАЯК

**Ніна Зяневіч**

Дарога палявая
І лесу аніяк.
– Куды вядзе такая?
– У вёсачку Маяк.

Калісьці вёска наша
Інакшаю была.
Замест дарогі – каша,
Балота ўкол сяла.

А кветак, птушак, качак!
Было іх не злічыць.
Цяпер усё іначай.
Вальготней сталі жыць.

Балота асушылі,
Дарогі правялі,
І кветкі загубілі,
І птушкі ўцяклі.

Дый вёска сама гіне,
Старэюць людзі ў ёй.
А колькі па краіне
Бяды такой жывой!

Усё поле нас гадуе.
А каго – рэчка, гай.
Любоў, кажуць, ратуе.
Люблю цябе, мой край!

## ДЗЕ НАРАДЗІЎСЯ, ТАМ І ЗГАДЗІЎСЯ

**Ніна Зяневіч**

Дзе нарадзіўся, там і згадзіўся…
Лёс падарыў мне Дзюдзеў.
Тут нарадзілася, тут і згадзілася.
Адсюль я і выйшла ўлюдзі.

Гады нашы звычкі мянялі
(Без гэтага, бачыш, ніяк)
І вёску маю назвалі
Зараз ужо Маяк.

Вёска наша адкуль пайшла?
Хачу знаць гісторыі вехі,
Гісторыю, памяць сяла
І ўзлёты яго, і агрэхі.

Сямнаццатае стагоддзе…
Лясы, балоты вакол.
І гэтае вось угоддзе
Хтосьці ўбачыў, знайшоў.

Мне разглядзець цяпер бы,
Як яно ўсё было
Хто пасадзіў вязы, вербы,
Якімі адметна сяло?

Мне б вузельчык той развязаць
І памяць ускалыхнуць,
Каб усё праўдзіва сказаць
І пра ўсё ўспамянуць

## САДЫ І АГНІ МАЯКА

**Ніна Зяневіч**

Ні Ясельды пабач, ні бору,
Ні Нёмана, ні ручайка,
А мне наймілейшым узорам
Здаюцца палі Маяка.

Прасторы адкрыты шырока.
Дзівіся, які далягляд!
І радуюць сэрца і вока
І хата, і дворык, і сад.

Тут мама калісьці вучыла
Праўдзе і дабрыні,
Урокі цярпення дарыла-
Дарма не прайшлі яны.

Дзяцінства плыве ўспамінам…
Колькі забаў сышло!
Гусі і качкі клінам
Цешылі ўсё сяло.

Кружылі буслы над хатамі,
Віталі гаспадароў.
А вечарам статак рагаты
Вяртаўся з удоем дамоў.

Дзеці сябе забаўлялі,
Глушылі птушыны звон,
У розныя гульні гулялі.
І гэтак было здавён…

Гады міналі і мянялі
Ў вёсцы жыццё, дабрабыт.
Цяпер ужо іншымі сталі
Сяляне, іх хаты і быт.

А ўсё ж бусел над вёскаю кружыць,
Зязюлька лічыць гады.
Нехта смуткуе і тужыць
А хтосьці шсчаслівы заўжды.

Няма хоць ракі і бору,
Але відаць здаляка
Маяцкія нашы ўзоры,
Сады і агні Маяка.

## ПАЎСТЫНІ

**Аляксей Калядка**

Дзякуй, вёсачка Паўстынь,
Што дала ты мне прытулак,
Каб ачомацца, астыць
Ад маіх няўтульных думак
Не пайсці ў небыццё –
Працягну к табе далоні,
Мо, ты зменіш мне жыццё
Ад бяды мяне заслоніш.
Можа, твой працоўны люд
Дасць мне сілы жыць нанова.
Можа, шчасце знайду тут
Ці хаця б жыцця асновы.

## У ЮНАЦКІМ СЭРЦЫ

**Васіль Лешчанка**

Між цяністым борам
І шырокім полем.
Дзе дубы над Случчу
Сталі на вякі.
Там садамі вёскі
Славяць наваколле,
І мая між імі вёска Кулікі.
У красе радзімай
Мой выток жыццёвы.
Бо ў куточку гэтым
Свет убачыў я.
Мне прырода шчодрасць
Даравала ў мове —
Навучыла сэрцам
Слухаць салаўя.
Стрэў сваё юнацтва
Я ў нялёгкім часе.
І сям'і на радасць
Першы верш свой склаў.
Гартаваўся працай у сваім калгасе.
А пасля ў горад лёс
Мяне паслаў.
У юнацкім сэрцы успамін здалёку,
Ён забыць куток мой век мне не дае.
То здаецца: бусел рассыпае клёкат.
То шпачок на вішні песенку пяе.
Сёння той старонцы аднаго жадаю:
Хай яе ніколі гора не кране.
Вёску ж, як матульку, родную вітаю.
Што на шлях шырокі вывела мяне.

## ПАЎСТЫНЬ - МАЯ РАДЗІМА

**Рыгор Магілявец**

Мая родная, блізкая вёска Паўстынь,
Я з дзяцінства табой ганаруся.
Праз гады да яе, сэрца, ты не астынь,
Бо не раз зноў сюды я вярнуся.
Дзе любіў пазіраць, як настойліва гнаў
Вецер у полі жытнёвыя хвалі.
І аблокі бялюткія, быццам бы зваў,
У бязмежныя, сінія далі.
Дзе ў летку ў гарачым ад сонца пяску,
Грэлі мы свае босыя ногі.
І ў зусім маладым і прыгожым ляску
Пракладалі лясныя дарогі.
Прайшоў час, а зрабілася ты маладзей,
Ну, а я стаў старэйшым, вядома
Сустракаю знаёмых і блізкіх людзей,
Адчуваю сябе, быццам дома.
Бо ў Паўстыні маёй, дома я сапраўды,
Мае корні адгэтуль зыходзяць.
Бацькі сёння жывуць, а жылі і дзяды,
Каранны я паўстынец выходзіць...

## РОДНАЯ ВЁСКА

**Вольга Махлай**

Гацук — майго жыцця старонка,
Дзе льецца песня жаваронка,
Дзе сонца ласкава смяецца,
Дзе ўсё жыве. Тут б’ецца сэрца
У кожным дрэўцы, кветцы мілай,
Тут лес патройвае нам сілы.
Душа радзімы тут лунае
І чысцінёю абхінае.

## ЗА ЦЯБЕ, МАЯ ВЁСКА, МАЛЮСЯ...

**Ганна Міклашэвіч**

За цябе,
мая вёска,
малюся,
Бо жыву,
нарадзілася тут,
На прасторах святой Беларусі,
Самы родны і велічны кут.

Я малюся за родную школу,
Што трывалыя веды дае,
Загартоўвае сэрца і волю,
За сяброў, што страчаюць мяне.

Я малюся за рэчку малую,
Дзе на святы збіраю аер,
За сівую царкву векавую,
Адрадзілі якую цяпер.

Я малюся за роднае поле,.
За мурожны духмяны лужок…
Маю душу ратуе раздолле —
Тут аснова мая і выток…

Я малюся за маму і тату,
Што мяне навучылі любіць
Агарод наш і сад, нашу хату,
Навучылі шчасліваю жыць.

Я за родную мову малюся,
У сяле што спрадвеку жыве…
Вёска Грэск у маёй Беларусі,
Вы знайдзіце на карце яе…

Але лепш завітайце ў госці
Шчыра стрэне вясковы наш люд.
Вы не страціце — знойдзеце штосьці,
Што пазбавіць душэўных пакут.

На прасторах МАЁЙ Беларусі
Самы родны і велічны кут…
За цябе, МАЯ ВЕСКА, малюся,
Бо жыву, нарадзілася тут!

## ВЕСНА В ДЕРЕВНЕ

*(с натуры)*

**Владимир Праневич**

Пахнет прелою соломой.
На шестке петух поет.
И корова возле дома
Жвачку медленно жует.
А теленок — постреленок
Задрал голову в зенит.
Там, под небом, жаворонок
Из последних сил звенит.

Вдруг открылась дверь сарая,
Что укрылся у присад,
И, друг друга обгоняя,
Поросята сыплют в сад.

Куры почву разгребают
Все глотают, что найдут.
Только-только начинают
Пчелы свой заветный труд.

И овца блеет в сарае,
Тоже требует свое.
Но ее не выпускают:
Нету паши для нее.

Под березами пасется
Небольшое стадо коз.
Гул машин с полей несется —
Завершает сев колхоз.

Вдоль забора пара уток
Ходит важно взад-вперед.
Никому здесь не до шуток.
Все полны земных забот.

*д. Б. Падерь*

## «ЯЧАЎСКІЯ ВЯЧОРКІ»

**Ніна Фралова**

Ячаўскія вячоркі,
З ранку да позняй зоркі...
У Ячаве нарадзіліся,
Песняю заручыліся.

З крыніц жыватворнага краю,
Дзе песня зліваецца з сонцам,
Краіну сваю праслаўляю,
Пяшчоту ёй сыплю бясконца.

Душа ад прастога народа
З нашчадкам ў сугалоссі,
Цудоўнай вясёлкай прырода
Дзе раніцу будзіць калоссе.

Пахучая лустачка хлеба,
Народнае песні багацце,
Узоры блакітнага неба,
І шчасце, і радасць у хаце.

Вяночкам спляту пералівы
І мару сваю загадаю,
А подых вячэрні, імклівы
Зноў поспехаў новых жадае.

Вытокам Случчанскага краю,
Багаццем зямлі адзавуся.
Я песню табе прысвячаю,
Зямля, што завуць Беларуссю!

Ячаўскія вячоркі,
З ранку да позняй зоркі...
У Ячаве нарадзіліся,
Песняю заручыліся.

## НАША ВЁСКА

**Міхаіл Янковіч**

Выгляд сёння нашай вескі
І з прыкметай аднае:
Усюды ліпы і бярозкі
Упрыгожваюць яе.
У случчанскім нашым краі
Цяпер вёска не адна,
А сваю мы ўспамінаем:
Старажытная яна.
Гады доўгія міналі,
Толькі вечнае адно:
Што Падліпцамі назвалі
Вёску гэтую даўно.

# ТЧЭ,

# ЗАБЫЎШЫСЯ, РУКА

## СЛУЦКІ ПОЯС

**Анатоль Астрэйка**

Нада мною блакітны шацёр,
А навокал – лясы і лясы,
Мая Случчына з тысячы зор
Тчэ на восень свае паясы.

І калі ўсё збярэ ў палатно
І павесіць бяліць цераз край,-
Будзе цёмнаю ночкай відно,
Хоць іголкі на сцежцы збірай.

Млечным Шляхам завецца здаўна
Гэты пояс, што лёг цераз бор,
Што саткала мая старана
З маладых і не гаснучых зор.

І ступаючы лёгка на мхі,
На палянкі някошанах траў,
Мы па зорцы шукаем шляхі
Да варожых часцей і застаў.

А калі мы вяртаемся ў бор,
На шляхах падарваўшы масты,
Apадаюць на сівы чабор
Зоры ціхім туманам густым.

Ахінаюць кілімам наш пуцъ
Да зямлянак праз шум баравы,
А над намі у вырай лятуць
Даўнім шляхам сваім журавы.

## СЛУЦКІЯ ТКАЧЫХІ

**Максім Багдановіч**

Ад родных ніў, ад роднай хаты
У панскі двор дзеля красы
Яны, бяздольныя, узяты
Ткаць залатыя паясы.

І цягам доўгія часіны,
Дзявочыя забыўшы сны,
Свае шырокія тканіны
На лад персідскі ткуць яны.

А за сцяной смяецца поле,
Зіяе неба з-за вакна —
І думкі мкнуцца мімаволі
Туды, дзе расцвіла вясна,

Дзе блішча збожжа ў яснай далі,
Сінеюць міла васількі,
Халодным срэбрам ззяюць хвалі
Між гор ліючайся ракі.

Цямнее край зубчаты бора…
І тчэ, забыўшыся, рука
Заміж персідскага узора
Цвяток радзімы васілька.

## СЛУЦКІ ПОЯС

**Мікола Мятліцкі**

Красуе сонца залатое,
Пераліваецца ў зару.
І зноў у рукі слуцкі пояс
З душой адкрытаю бяру.

Мой край, мой сімвал ясназорны
Не схмурыць часу беглы цень.
Якія ясныя ўзоры
На ім люструе новы дзень!

Паўстане Случчына так гожа
У ззянні кветкі васілька.
На ніве тут гадуе збожжа
Здавён сялянская рука.

І ўраджай такі – зашчодра
Чаруе ніва земляка.
І ткуць напружаныя бёрды
Цвяток радзімы васілька.

## СЛУЦКІЯ ПАЯСЫ

**Рыгор Родчанка**

Як сведчаць навукі скрыжалі
І факты ў нашы часы,
Ніколі яшчэ не спынялі
На Случчыне ткаць паясы.

Хіба ж тых успомніць не варта,
Што нам сярод цёмных лясоў
Высноўвалі пояс ўпарта
З лугоў і ўрадлівых палёў?..

Каб дзецям мець хлеба кавалак,
А не дзеля ўласнай красы,
Дбайна ткалі і ўдала
На Случчыне ў нас паясы…

Калі ў час вайны ва ўвесь голас
Да зброі заклікаў урад,
На Случчыне выткалі пояс
З сямі партызанскіх брыгад.

А сёння на Случчыне людзі
Радзіме зноў ткуць паясы,
Скажу па сакрэту, што будуць
Яны надзвычайнай красы.

## МОЙ СЛУЦКІ ТКАЧ

*ВЕРШАВАНЫ ПОЯС*

**Аксана Спрынчан**

### Нітка шаўковая

Цябе ў табе шукаю
мо таму,
што адчуваю —
я ў табе таксама...
Цябе ў табе шукаю
і чакаю,
што ты мяне ўва мне
перабіраеш,
выцягваючы ніткі залатыя,
каб слуцкі пояс ткаць...
Ёсць толькі ў вершы
слуцкія ткачыхі,
ёсць у жыцці — мой слуцкі ткач.

### Нітка жыцця

Знайшла цябе,
каб апасля згубіць,
але й жыву,
каб апасля памерці...
Знайшла цябе,
маланку прыгубіла,
не апяклася,
апякла,
ды пекла
стваралася, відаць, не нам,
мы там, дзе пекна,

дзе кожны і знаходзіць, і губляе,
жыццё зямлі маланкай працінае…

## Нітка мінулага

Ты для мяне —
бадай паэма…
Паэма ў прозе…
Я столькі мёртвых душ
знайшла ў табе,
але яны жылі,
няхай і да мяне,
кахалі і гукалі,
калі Радзіму, а калі й цябе…
Ды, нават адшукаўшы,
адчувалі —
не іх радзімкі
пад сваёй рукою схаваеш ад маланак і святла.

## Нітка абярэгу

Цяжкая праца —
ткаць жыццё чужое
ці нават толькі пояс ад яго,
тым болей —
слуцкі,
на чужых узорах
стварацць, забыўшыся,
сваё…
Ткаць так,
каб заставаліся легенды,
ткаць так,
каб паўтарыць ніхто не змог

тваё жыццё,
сатканае з маім,
маё жыццё,
сатканае ў радок,
які, як пояс,
можа слуцкім стаць,
нібыта пояс,
нас аберагаць...

**Нітка залатая**

Ты кветкі Радзімы
ўплятаеш у косы мае,
забыўшыся —
пояс не тчэцца.
Ніякага сэнсу...
Ды жаўранак у вышыні
спявае,
што спее калоссе ў красе
і вечнасць,
схаваная ў зернейку кожным,
вось-вось усміхнецца.

**Нітка срэбная**

І ўдзень,
і калі зойдзе сонца,
ты пояс тчэш,
мой слуцкі ткач.
Удзень
ты з залатою ніткай,
уночы —
срэбная ў руках.

І я, стамлёная ад сонца,
чакаю срэбнае начы,
калі з рабра твайго ўзнікаю,
калі маланкі нас яднаюць,
знікаюць у шаўковым ложку
шчэ не апошняе зары...

**Нітка кахання**

У вушка маланкі
працягваеш нітку кахання
і ёю сшываеш нябёсы,
параненыя расстаннямі,
параненыя самотаю
і прыгажосцю,
якую ўжо разарвалі Ён і Яна.
Хай гэта пакуль не пра нас,
ды нехта калісьці
нябёсы, што мы паранілі,
сшые кахання ніткай,
самай празрыстай і чыстай...

**Нітка бясконцасці**

Калі ўсе ніткі ў вашае душы
завяжуцца так шчыра,
як маглі вы дыхаць
у чужым жыцці,
якое на маланку
стала вашым,
вы самі вытчаце
чытацкі поясі згубіце...
Бадай што будзе так...

## СЛУЦКИЕ ТКАЧИХИ

*(из Максима Богдановича)*

**Микола Трус**

Родной не увидать им хаты,
Умолкли близких голоса...
Они в хоромы князя взяты
Ткать золотые пояса.

Идут года, тускнеют взоры,
Отрады не приносят сны...
Они персидские узоры
Ткать для господ обречены.

А за окном - родное поле,
Во ржи мелькают васильки...
И мысль о недоступной воле
Блеснет, как серебро реки.

Зовет их бор весенней песней,
Крепка решётка на окне...
В груди больному сердцу тесно,
Оно тоскует о весне.

Темнеет край зубчатый бора...
И ткёт безвольная рука
Взамен персидского узора
Родимый образ василька.

## СЛУЦКІЯ ПАЯСЫ

**Ніна Фралова**

Разлівы шаўковага поля,
Уток з залатога спляцення,
У колерах – шчасце і доля,
Гісторыя Слуцка ў адценнях.

Слуцкі пояс – у квецені колас,
Слуцкі пояс – гісторыі колас,
Слуцкі пояс – з мінулым спатканне,
Слуцкі пояс – радзіме прызнанне.
Матывы народа ў прасторы,
Багацце Случчанскага краю.
З калосся і кветак узоры
Сярод чужаземцаў пазнаю.

Слуцкі пояс – у квецені колас,
Слуцкі пояс – гісторыі колас,
Слуцкі пояс – з мінулым спатканне,
Слуцкі пояс – радзіме прызнанне.

У марах над нітам схілюся –
Асновы ўзор новы грае,
І зноў прыгажосці дзіўлюся,
Візіткай Случчанскага краю.

Слуцкі пояс – у квецені колас,
Слуцкі пояс – гісторыі колас,
Слуцкі пояс – з мінулым спатканне,
Слуцкі пояс – радзіме прызнанне.

# СЛУЧЧАНСКАЯ ЗЯМЛЯ НА ТАЛЕНТЫ БАГАТА

## МОЕ ПОЖЕЛАНИЕ МОЛОДЫМ ПОЭТАМ СЛУЧЧИНЫ

**Петр Девятериков**

Я со стажем поэт из тайги,
Из Саян, Красноярских гор.
С Енисея - великой реки
Где цветов разноцветья ковер.

По годам я, конечно, старик,
Только в сердце не гаснет огонь.
Я бывалый солдат-фронтовик,
А стихи для меня, как гармонь.

Я люблю вас - людей молодых,
И завидую Вам не стыдясь.
Не один сочинили вы стих,
Где любовь с вашей жизнью сплелась.

На тот свет я пока не хочу,
Есть желание жить и творить.
Иногда как на крыльях лечу
Чтобы Музе еще послужить.

Кое-кто может вспомнит меня,
Через несколько прожитых лет.
В ваших рифмах и ритмах звеня,
Вашей памятью буду согрет.

И хочу напоследок сказать,
Я счастливый всегда, среди вас.
И по-прежнему буду мечтать
На Пегасе взлететь на Парнас.

Может быть не достоин быть там,
Вам желаю, чтобы вы поднялись.
Пусть фортуна сопутствует вам!
И сейчас и на долгую жизнь!

## «ОРЛЯТАМ»

**Петр Девятериков**

*Посвящаю бывшим Десятиклассникам
Знаменской СШ в день двадцатилетия
окончания школы (1977-1997гг)*

Дорогие мальчишки, девчата
Я вас помню и очень люблю
Вы мои дорогие «Орлята»
Это искренне я говорю.

Вспоминаю, какими вы были
Непоседливы, чисты, умны.
А когда было трудно — не ныли,
Дружбой классов все были сильны.

Чтобы знали военное дело
Не жалел я себя, да и вас.
Крепли знания, воля и тело,
Это видно наглядно сейчас.

Вы на сборах частенько потели
Наступая, кричали «Ура!»
Дружно песни об армии пели
И окопы копали с утра.

В тире меткой стрельбе обучались,
Но мишеням, без всяких помех.
С автоматом на ты обращались
Этим вам похвалиться не грех.

Много раз выступали с успехом,
На «Орленке» — военной игре.
К тем годам возвращает нас эхо
К светлым мыслям о школьной поре.

Вы сейчас повзрослели, женаты
Вышли замуж, растите детей,
Может жизнью тяжелой прижаты
Все же помните класс и друзей.

Рад безмерно — меня не забыли,
Пригласили на встречу свою.
Мы ведь честно, без лести дружили,
Вместе с вами сегодня спою.

Вам и детям желаю здоровья
Оптимизма, успехов, добра,
Строите жизнь интересно, с любовью,
С юбилеем, «Орлята», Ура!

## УЧИТЕЛЯМ ЗНАМЕНСКОЙ СШ

**Петр Девятериков**

Дорогие коллеги, привет!
С днём Учителя вас поздравляю!
Я дарю вам с поклоном букет,
Всем здоровья и счастья желаю.

Пусть всё ладится в школе у вас,
Зря не хмурьте красивые брови,
Всем живётся не сладко сейчас,
Чаще смейтесь, не будьте суровы!

Берегите, жалейте детей,
Проявляйте заботу и ласку,
Не ругайте без дела мужей,
Сохраняйте семейную связку.

Чтоб, как снег не белели виски,
Раньше времени вы не старели.
И не знали зелёной тоски,
Словно пули года не летели.

Чарку выпить сегодня не грех,
Поплясать и попеть — как бывало.
Чтоб в селе уважали вас всех,
А детей и внучат прибывало.

А мужчинам хочу дать совет:
Ваших женщин прекрасных любите.
Исполняйте старинный завет
Как сестёр и как мать берегите.

